ПА МАРШРУЦЕ «СВЯТОЙ РАДАСЦІ» 6

ВЯШЧАЕ «МІР 24» 19

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

1 КАСТРЫЧНІКА 2021 г.
ПЯТНІЦА
№ 189 (29558)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
+TV ПРАГРАМА

ЦЫТАТА ДНЯ

Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА, Старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу:

«28 верасня ў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь быў дэталёва абмеркаваны праект новай рэдакцыі Асноўнага Закона краіны, падрыхтаваны Канстытуцыйнай камісіяй. Зараз яго трэба будзе дашліфаваць, у гэтай справе павінны прыняць актыўны ўдзел дэпутаты. Затым праект будзе вынесены на грамадскае абмеркаванне, а на пачатку наступнага года — на рэспубліканскі рэферэндум. Мы са свайго боку на адкрыцці шостай сесіі павінны прыняць законапраект аб змяненні Канстытуцыі па пытанні ўвядзення адзінага дня галасавання».

НАША ЯДНАННЕ БЫЛО Б НЕМАГЧЫМАЕ БЕЗ КАНСАЛІДАЦЫІ ЎСІХ ПАКАЛЕННЯЎ

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў грамадзян старэйшага пакалення з Днём пажылых людзей.

«Гэта свята яшчэ раз нагадвае нам пра культурны код беларусаў, у якім вялікая павага да старэйшых з'яўляецца найважнейшым прыярытэтам у грамадстве, а мудрасць і багаты жыццёвы вопыт заўсёды ляжаць у аснове прыняцця лёсавызначальных рашэнняў», — адзначыў кіраўнік дзяржавы. «Сёлетні год аб'яўлены Годам народнага адзінства, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Наша яднанне было б немагчымае без кансалідацыі ўсіх пакаленняў у імкненні забяспечыць мір і згоду на роднай зямлі, будаваць будучыню сваёй краіны, абапіраючыся на праверанныя часам традыцыі і каштоўнасці. Гарантам іх захавання з'яўляецеся менавіта вы, людзі залатога ўзросту. Таму адным з асноўных кірункаў дзяржаўнай палітыкі была, ёсць і будзе сацыяльная абарона пажылых грамадзян».

У віншаванні гаворыцца, што сёння ў Беларусі выбудавана разгалінаваная сістэма па падтрымцы і павышэнні якасці жыцця гэтай катэгорыі насельніцтва, пашыраюцца магчымасці для актыўнага даўгалецця і самарэалізацыі.

Прэзідэнт пажадаў усім і ў святы, і ў будні моцнага здароўя, выдатнага настрою, душэўнага спакою і дабрабыту.

Райскі куток у Звяздзе

У вёсцы Звязда Лепельскага раёна жывуць пераважна людзі пенсійнага ўзросту. Тым не менш яны вельмі працавітыя, клапоцяцца пра свае сады-агароды, паказваюць прыклад дбайнага стаўлення да зямлі. У Валянціны НАВАГРАН, былога агранома, а пазней старшыні былога Пышнянскага сельскага Савета дэпутатаў, і падворак, і сам дом вельмі акуратныя і прыгожыя, а на прысядзібным участку — яблыневы сад. Многае па доглядзе Валянціна Сцяпанаўна робіць сваімі працавітымі рукамі, таму яе ўтульны падворак называюць не інакш як райскім куточкам.

Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.

КАРАТКА

- **МАЗ прадставіў новую тэхніку на выстаўцы «ТэхІнаПрам».**

- Узнагароджанне пераможцаў Нацыянальнай тэатральнай прэміі адбудзецца 28 кастрычніка ў Купалаўскім.
- **Беларускія і расійскія вучоныя прадставілі ў Мінску распрацоўкі для нафтагазавай прамысловасці.**
- Няўлічанае пахаванне расстраляных у гады вайны мірных жыхароў выявілі ў Вілейскім раёне.

ISSN 1990 — 763X

З нагоды

КЛОПАТ І ДАПАМОГА

Пажылым грамадзянам — асаблівая ўвага

За апошнія 10 гадоў доля пажылых людзей у Беларусі вырасла, і сёння колькасць такіх грамадзян складае больш за 1,5 млн, паведаміла падчас прэс-канферэнцыі, прымеркаванай да Дня пажылых людзей, начальнік галоўнага ўпраўлення сацыяльнага абслугоўвання і сацыяльнай дапамогі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Таццяна ФЁДАРАВА.

Рост колькасці пажылых грамадзян сёння — сусветная тэндэнцыя, падкрэсліла спікер. Старэнне насельніцтва — заканамерны незваротны працэс, і звязаны ён з развіццём тэхналогій і ростам эканамічнага дабрабыту.

Па словах Таццяны Фёдаравай, у Беларусі на дзяржаўным узроўні папулярызуецца ідэя актыўнага даўгалецця. «З мэтай усебаковага ўліку пытанняў старэння і для прыняцця рашэнняў ва ўсіх сферах жыццядзейнасці нашага грамадства ў снежні 2020 года ўрадам была зацверджана Нацыянальная стратэгія Рэспублікі Беларусь «Актыўнае даўгалецце 2030», — паведаміла прадстаўнік Мінпрацы. Мэта стратэгіі — найбольш поўнае раскрыццё патэнцыялу пажылых людзей, а таксама ўстойлівае павышэнне якасці іх жыцця.

У Беларусі шырока развіта сетка ўстаноў сацыяльнай падтрымкі: 146 тэрытарыяльных цэнтраў сацыяльнага абслугоўвання, 83 стацыянарныя ўстановы, 155 аддзяленняў дзённага знаходжання пажылых. Дапамога «сярэбранаму пакаленню» шматузроўневая: ад сядзелкі і наведвання сацработнікам да навучання свайму догляду чалавека з дэменцыяй ці інваліда.

СТАР. 4

Прыкметы часу

ХТО ТАКІЯ СКАМЕРЫ?

Як змяніліся махлярствы ў трэцім тысячагоддзі

З кожным годам у свеце расце колькасць злачынстваў, якія здзяйсняюцца праз інтэрнэт і з дапамогай сродкаў мабільнай сувязі. У Беларусі за 8 месяцаў гэтага года такім чынам было здзейснена амаль 10 000 крадзяжоў грашовых сродкаў. Пра тое, як не стаць ахвярай кіберашуканцаў, мы запыталіся ў намесніка начальніка галоўнага ўпраўлення па супрацьдзеянні кіберзлачыннасці МУС Уладзіміра ЗАЙЦАВА.

СТАР. 5

«Беларусь мае намер выбудоўваць сяброўскія адносіны з тымі дзяржавамі, якія паважаюць нашы суверэнітэт, незалежнасць і наш народ»

Цырымонія ўручэння даверчых лістоў адбылася ў Палацы Незалежнасці

Прэзідэнту Беларусі Аляксандру Лукашэнку іх уручылі: пасол Азербайджана Ульві Вагіф аглы Бахшаліеў, пасол Арменіі Размік Хумаран, пасол Індыі Алок Ранджан Джа, пасол Інданезіі Хасэ Антоніа Марата Таварэс, пасол Лівана Шаукі Бу Насар, пасол Малайзіі Бала Чандран Тарман, пасол Манголіі Батсух Баярсайхан, пасол Туніса Тарак Бен Салем, пасол ПАР Мзувукіле Джэф Макетука.

Перыяд важных пераўтварэнняў

Звяртаючыся да новых паслоў, Прэзідэнт падкрэсліў, што пачатак іх дыпламатычнай місіі прыпадае на перыяд важных пераўтварэнняў у Беларусі, але размова ідзе не пра глабальную змену прыярытэтаў.

«Гэта найперш унутраныя справы нашай краіны. ***Для забеспячэння дынамікі далейшага развіцця беларускага грамадства, карэкціроўкі ўнутранай і знешняй палітыкі ў краіне аб'ектыўна наспела патрэба перамен,*** — кажа Прэзідэнт. — Сённяшняя цырымонія праходзіць у Год народнага адзінства, мэтамі якога з'яўляюцца далейшая кансалідацыя грамадства, узмацненне яго патрыятычных асноў, яднанне шматнацыянальнага беларускага народа на аснове ідэй суверэнітэту і незалежнасці краіны».

Па словах Аляксандра Лукашэнкі, ***справядлівасць у міжнародным, міждзяржаўным узаемадзеянні і ў правядзенні ўнутранай палітыкі — гэта тое, што Беларусь выпакутавала сваёй гісторыяй і ў найноўшы перыяд, падзеі якога разгарнуліся на нашых вачах.***

«Сёння Беларусь у прыярытэтным парадку мае намер выбудоўваць сяброўскія адносіны з тымі дзяржавамі, якія сапраўды паважаюць нашы суверэнітэт і незалежнасць, паважаюць наш народ. З тымі, хто гатовы развіваць узаемадзеянне з намі шчыра і адкрыта», — сцвярджае кіраўнік краіны.

На яго думку, знаходзячыся на граніцы паміж Захадам і Усходам, Беларусь, як ніякая іншая краіна, разумее важнасць стваральнага аб'яднальнага міжнароднага парадку і нязменна працуе над яго практычным выкананнем. Гэта датычыцца і тэмы міграцыі, якая атрымала апошнім часам шырокі рэзананс.

«Мы надаём першаснае значэнне пытанням бяспекі, ахове дзяржаўнай мяжы. Наша краіна заўсёды была адказным удзельнікам калектыўных намаганняў па супрацьдзеянні кантрабандзе, гандлю людзьмі. Гатовы быць такімі і далей, але толькі пры ўмове паважлівага да нас стаўлення, а не пад ціскам санкцый і ультыматумаў. Тым больш гібрыдных войнаў», — заяўляе Аляксандр Лукашэнка.

Ён адзначае, што Беларусь заўсёды была прыхільнікам узаемавыгаднага гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва з усімі міжнароднымі партнёрамі і адкрытай да новых сумесных праектаў, уключаючы самыя перадавыя і высокатэхналагічныя.

Пры гэтым, дадае Прэзідэнт, Беларусь вельмі цэніць узровень узаемадзеяння з краінамі СНД. З імі звязваюць самыя моцныя сувязі братэрскага сяброўства, якія, верагодна, будуць і далей дапамагаць паглыбляць адносіны, развіваць гандаль і кааперацыю па разнастайных напрамках дзеля дабрабыту народаў.

Кажучы пра сувязі з Азіяй, кіраўнік краіны заўважае: рэгіён эканамічна расце хутчэй за іншыя ў свеце, а Беларусь і многія азіяцкія краіны камплементарныя ў сваім узаемадзеянні.

«Мы зацікаўлены ў пашырэнні супрацоўніцтва з краінамі Афрыкі, дзе ў нас ужо ёсць прыклады паспяховай сумеснай працы, якія, упэўнены, будуць памнажацца. Беларусь можа быць цікавай як пляцоўка для развіцця гандлю з краінамі ЕАЭС, з Расіяй, з якой мы рэалізуем амбіцыйны інтэграцыйны праект, што адкрывае новыя магчымасці для бізнесу, навукі і іншых сфер», — канстатуе Прэзідэнт.

Паводле яго, як сур'ёзны прамысловы хаб Беларусь можа ажыццяўляць выгадныя пастаўкі сельскагаспадарчай і горназдабыўной тэхнікі, кар'ерных самазвалаў, калійных угнаенняў, нафтахімічнай і фармацэўтычнай прадукцыі. Нашы кампаніі гатовыя прапанаваць свае навукова-тэхналагічныя і вытворчыя распрацоўкі, падзяліцца паспяховым вопытам мадэрнізацыі энергетычнага, транспартнага і камунікацыйнага сектараў, стварэння сельскагаспадарчых вытворчасцяў поўнага цыкла.

Айчынныя ВНУ, кажа Прэзідэнт, могуць прымаць абітурыентаў для навучання па разнастайных запатрабаваных напрамках, уключаючы падрыхтоўку па спецыяльнасцях у сферах прамысловасці, сельскай гаспадаркі і аховы здароўя.

Ад СНД да «далёкай дугі»

Прэзідэнт расставіў акцэнты на прыярытэтах узаемадзеяння з кожнай прадстаўленай на сустрэчы краін.

Азербайджан, па яго словах, быў і застаецца нашым стратэгічным партнёрам, братэрскай дзяржавай, якая паступова і без выгоды падтрымлівае Беларусь. Прэзідэнт падзякаваў азербайджанскаму народу і свайму калегу Ільхаму Аліеву за давер і надзейнасць.

«З Арменіяй нас звязваюць традыцыйна сяброўскія адносіны, сумесная гісторыя і цесныя міжасабовыя кантакты. Нашы краіны актыўна ўзаемадзейнічаюць у рамках інтэграцыйных структур, у большасці выпадкаў выступаючы з адзіных пазіцый. Пакуль значны патэнцыял двухбаковага супрацоўніцтва не рэалізаваны ў поўнай меры. Але Беларусь адкрытая для прапаноў па далейшым развіцці трывалых адносін з Арменіяй ва ўсіх сферах», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт акцэнтуе ўвагу: ***міжнародная сітуацыя, што складваецца, павышае для Беларусі значэнне супрацоўніцтва з краінамі «далёкай дугі»***.

«Мы высока цэнім заснаваныя на сяброўстве, даверы і ўзаемаразуменні адносіны з Індыяй. Мінск і Нью-Дэлі — найважнейшыя партнёры, і патэнцыял двухбаковага ўзаемадзеяння бязмежны. Хачу асабліва падкрэсліць імкненне Беларусі выбудоўваць канструктыўныя адносіны з усімі краінамі — членамі Асацыяцыі дзяржаў Паўднёва-Усходняй Азіі. Упэўнены, дадатковыя магчымасці для далейшага развіцця беларуска-інданезійскіх і беларуска-малазійскіх сувязяў дадуць узмацненне супрацоўніцтва па лініі ЕАЭС — АСЕАН», — кажа кіраўнік краіны.

Паводле яго, Рэспубліка Інданезія — наш ключавы партнёр у гэтай асацыяцыі, а нашы грамадзяне, прадстаўнікі бізнесу і навуковых колаў ведаюць гэту дзяржаву не толькі як турыстычную жамчужыну, але і як краіну з эканомікай, якая дынамічна развіваецца, высокім чалавечым і навуковым патэнцыялам.

За апошнія дзесяцігоддзі Малайзія зрабіла велізарны рывок у сваім развіцці, сцвярджае Прэзідэнт. Таму мы вельмі зацікаўлены ў вывучэнні вопыту трансфармацыі вашай дзяржавы.

Надзейнага перспектыўнага партнёра, заяўляе Аляксандр Лукашэнка, Беларусь бачыць у Манголіі і адзначае далейшае развіццё практычнага ўзаемадзеяння паміж нашымі краінамі ў разнастайных галінах. «Мы зацікаўлены ў працягу рэалізацыі сумесных праектаў. У апошнія гады нашы дзяржавы многага дасягнулі, але я ведаю: у нас яшчэ ёсць дадатковыя магчымасці для далейшага развіцця ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва, у тым ліку ў машынабудаўнічай галіне», — падкрэслівае Прэзідэнт.

Беларусь праяўляе цікавасць да ўзаемадзеяння з Ліванскай Рэспублікай, разглядае Туніс у якасці перспектыўнага партнёра ў Паўночнай Афрыцы і зацікаўлена ў актывізацыі ўсебаковых адносін.

«Нам трэба больш актыўна шукаць напрамкі, якія дазволяць узмацніць наша ўзаемадзеянне. У першую чаргу гэта датычыцца сфер турызму і аховы здароўя», — звяртае ўвагу Прэзідэнт.

Беларусь гатова і далей прасоўваць супрацоўніцтва з Паўднёва-Афрыканскай Рэспублікай, якая па праве мае рэпутацыю палітычнага і эканамічнага лідара сярод паўднёвых дзяржаў свайго кантынента, заяўляе Аляксандр Лукашэнка.

«Мы можам прапанаваць ПАР сумесныя комплексныя рашэнні ў сферы механізацыі сельскай гаспадаркі, актуальныя навуковыя распрацоўкі, трансфер тэхналогій і ведаў, адукацыйныя паслугі», — пералічыў кіраўнік краіны.

Прэзідэнт адзначае, што ў самым хуткім часе паслы ўпэўняцца: мы гатовыя да актыўнага супрацоўніцтва ва ўсіх сферах узаемнага інтарэсу.

«Чакаем ад вас аб'ектыўнага погляду на падзеі, накіраванасці на ўзмацненне двухбаковых адносін, ініцыятыўных дзеянняў у рэалізацыі новых праектаў», — кажа Прэзідэнт.

Марыя ДАДАЛКА.

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

Прэзідэнт даў інтэрв'ю амерыканскаму тэлеканалу «CNN»

Аб асабістай размове Аляксандра Лукашэнку папрасіла журналістка CNN падчас Вялікай размовы ў жніўні. Кіраўнік краіны тады пагадзіўся, але пры адной умове: «Калі вы дасце ўсё, што я скажу, не выразаючы, не дадаючы». І вось учора інтэрв'ю адбылося. Размаўляў з Аляксандрам Лукашэнкам міжнародны аглядальнік тэлеканала ў Расіі, кіраўнік карпункта Мэцью Чанс. Яго пытанні датычыліся бягучай палітычнай сітуацыі ў краіне, адносін з Расіяй і Захадам, мігранцкай праблемы.

Падчас размовы Прэзідэнт чарговы раз пракаментаваў здагадкі наконт таго, што Беларусь, развіваючы супрацоўніцтва з Расіяй, можа пазбавіцца незалежнасці і стаць свайго роду фарпостам на заходнім напрамку.

«Гэта абсалютнае глупства. Нядаўна я на гэтае пытанне чарговы раз адказваў. Мы з Пуціным, кіраўніцтвам Расіі і Беларусі, дастаткова разумныя, каб у рамках дзвюх незалежных, суверэнных дзяржаў стварыць такі саюз, які будзе яшчэ мацнейшы за ўнітарнае ўтварэнне, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — Такое пытанне (пра страту незалежнасці і ўваходжанне ў склад Расіі. — **«Зв.»**) у парадку дня наогул не стаіць. Гэта выдумка калектыўнага Захаду, як у нас кажуць».

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу: па сутнасці, Беларусь ужо даўно з'яўляецца фарпостам Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі, бо на заходнім напрамку створана адзіное войска. «У нас створана на гэтым заходнім напрамку адзіная ўзброеная групоўка, асновай якой з'яўляецца беларуская армія. І ў выпадку канфлікту мы гэта не ўтойваем, уся заходняя частка Узброеных Сіл Расіі нас будзе падтрымліваць».

Аляксандр Лукашэнка назваў вар'яцтвам шэраг дзеянняў і заяў урада Польшчы. «У вас ёсць факты, што я штурхаю гэтых людзей (бежанцаў. — **«Зв.»**) на граніцу з Польшчай? Няма і быць не можа», — падкрэсліў Прэзідэнт.

У адказ інтэрв'юер Мэцью Чанс сказаў: «Польскі ўрад сцвярджае, што бежанцаў дастаўляюць туды сілком, аж да таго, што іх шпігуюць наркотыкамі, амфетамінам. З тым, каб яны вельмі доўга не спалі, каб ім было лягчэй пераносіць халоднае надвор'е. І, такім чынам, яны ў гэтай сітуацыі аказваюцца ў пастцы. Вы станеце гэта адмаўляць?»

«Гэта вар'яцтва. Усё, што робіць польскі ўрад, гэта вар'яцтва. Вы кажаце, што мы кормім людзей наркотыкамі? Факты на стол! Будуць такія факты, я буду несці адказнасць», — заявіў кіраўнік краіны.

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на тое, што Беларусь не аб'яўляла надзвычайнае становішча, як гэта зрабіў польскі бок на мяжы. Ён запрашае журналістаў прыехаць на граніцу і аб'ектыўна разабрацца ў сітуацыі. Прэзідэнт расказаў, што бежанцам, якія заселі на граніцы, прапаноўвалі пабыць у Беларусі, асабліва з улікам будучых маразоў. «Мы іх просім: «Калі ласка, вярніцеся да маразоў у Беларусь, пабудзьце ў Беларусі». «Не, нам паабяцалі літоўцы і палякі палітычны або нейкі там прытулак, мы чакаем, — расказаў кіраўнік краіны. — Вось яны тры месяцы чакаюць вырашэння гэтага пытання. Пры чым тут беларусы?»

Аляксандр Лукашэнка таксама звярнуў увагу на тое, што міграцыйныя патокі ідуць у Еўрасаюз не толькі праз Беларусь, але і праз Іспанію, Італію, Грэцыю.

«Вы нядаўна публічна паклікалі афганцаў і папрасілі цэнтральнаазіяцкія краіны (былы СССР) і Расію, каб яны ім дазволілі там спыніцца. І еўрапейцам далі каманду прымаць усіх. Гэта ж прагучала на вашым канале. Чаму не прымаеце зараз людзей, якія бягуць ад вайны з тых краін, якія вы зрабілі банкрутамі?» — задаў рытарычнае пытанне кіраўнік дзяржавы.

Пасля размовы з Прэзідэнтам Мэцью Чанс адказаў на пытанні беларускіх журналістаў. Ён паведаміў, што мяркуе скарыстацца прапанаванай магчымасцю пагутарыць з Раманам Пратасевічам, наведаць беларуска-польскую граніцу і ўбачыць умовы ўтрымання бежанцаў.

«Я скарыстаюся гэтай магчымасцю абавязкова, бо мы хочам вывучыць усе доказы, што можа даць беларускае кіраўніцтва. Мы хочам усё пабачыць на свае вочы, у тым ліку і сітуацыю з бежанцамі на граніцы», — заявіў Мэцью Чанс.

Інтэрв'ю для тэлеканалу «CNN» адбылося пры ўмове поўнага дэманстравання ў эфіры адказаў Прэзідэнта на некалькі пытанняў і публікацыі на сайце тэлеканалу размовы без мантажу. Беларускія журналісты запыталі, ці будуць прытрымлівацца тэлевізіёншчыкі гэтых умоў, але атрымалі нечаканы адказ: «Мы не прымаем ніякіх абмежаванняў наконт таго, як выкарыстоўваць матэрыялы інтэрв'ю, і будзем выкарыстоўваць гэтыя здымкі як палічым патрэбным», — канстатаваў рэпарцёр.

Блізкая ўлада

ЁСЦЬ ПЫТАННІ? ТЭЛЕФАНУЙЦЕ!

Прамыя тэлефонныя лініі адбудуцца 2 кастрычніка ў аблвыканкамах і Мінгарвыканкаме.

Тэлефонныя лініі ў суботу з 9.00 да 12.00 правядуць:

• першы намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкама Валянцін Міхайлавіч ЗАЙЧУК, тэл. (8016) 2213121,

• намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама Барыс Сяргеевіч ЯФРЭМАЎ, тэл. (8021) 2222222,

• намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкама Андрэй Анатольевіч БАРАНОЎСКІ, тэл. (8023) 2331237,

• кіраўнік спраў Гродзенскага аблвыканкама Іван Іванавіч КУРМАН, тэл. (8015) 2735644,

• намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Сяргей Мікалаевіч МАСЛАЎ, тэл. (8022) 2501869,

• старшыня Мінскага абласнога Савета дэпутатаў Наталля Віктараўна ЯКУБІЦКАЯ, тэл. (8017) 5004160,

• старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў Андрэй Аляксандравіч БУГРОЎ, тэл. (8017) 2224444.

У Магілёве працуе «Скрыня дапамогі»

Дабрачынную акцыю ладзіць абласная арганізацыя Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа. На ўваходзе ў гандлёвы цэнтр «Парк Сіці» ў мікрараёне Казіміраўка ўстаноўлена спецыяльная скрыня, куды можна пакласці цёплыя рэчы і абутак, у тым ліку і тыя, што былі ў выкарыстанні. Адзіная ўмова — рэчы павінны быць у добрым стане і чыстыя. Іх потым перададуць тым, хто мае патрэбу: шматдзетным сем'ям, сіротам, інвалідам.

— Кантэйнер для адзення і абутку — наш першы вопыт, каб паглядзець, наколькі такая форма супрацоўніцтва будзе запатрабаваная, — удакладняе **старшыня Магілёўскай абласной арганізацыі Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа Андрэй МАРТЫНОЎСКІ.** — Галоўнае, каб людзі зразумелі, што гэта кантэйнер для добрых рэчаў, а не для тых, якія нікому не патрэбныя, у тым ліку і гаспадару, а выкінуць шкада. Мы займаемся фандрайзінгам для прыцягнення рэсурсаў для аказання дапамогі тым, хто мае ў ёй патрэбу. Для таго каб рабіць гэта зручна, камфортна і цывілізавана, быў зроблены такі кантэйнер. Мы прымаем пажадана новыя чыстыя якасныя рэчы, каб своечасова перадаць іх дзецям, сіротам, інвалідам. У рамках акцый (нядаўна гэта была «Збяром дзяцей у школу», хутка пачнецца «Клопат», потым «Ёлка пажаданняў» і гэтак далей) мы таксама праводзім фандрайзінгавыя мерапрыемствы. Прымаем адзенне, абутак, канцылярскія прылады, цацкі ад насельніцтва.

У найбліжэйшай будучыні Магілёўскае абласное аддзяленне збіраецца адкрыць рэсурсны цэнтр па дапамозе інвалідам і прымае ад насельніцтва інвалідныя вазкі, хадуны, мыліцы, шматфункцыянальныя ложкі для перадачы ў часовае карыстанне тым, каму яны неабходныя. Попыт на такія рэчы ёсць, і людзі пастаянна звяртаюцца ў Чырвоны Крыж з просьбай дапамагчы.

Андрэй Мартыноўскі таксама звяртае ўвагу, што таварыства дапамагае насельніцтву ў барацьбе з ковідам, прычым адразу па некалькіх кірунках: медыка-сацыяльная дапамога, дастаўка прадуктаў дадому, дапамога медыкам і службе сацыяльнай абароны ў выглядзе масак, дэзсродкаў, спецадзення, вырабаў медыцынскага прызначэння для правядзення прафілактычных мерапрыемстваў. Зараз гэта работа зноў актывізавана.

Да ведама: у вобласці функцыянуе 25 раённых арганізацый Чырвонага Крыжа, створана 1596 первічных арганізацый, якія аб'ядноўваюць каля 200 тысяч членаў Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа. Пад знакам Чырвонага Крыжа ў вобласці працуе каля 2000 валанцёраў.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

Хто вышэйшы ростам?

Дзелавая рэпутацыя і працаўладкаванне

БДУ ўвайшоў у ТОП-300 найлепшых ВНУ па ацэнцы работадаўцаў

Паводле абноўленай версіі брытанскага рэйтынга QS GER (Quacquarelli Symonds Graduate Employability Rankings), БДУ ўпершыню за пяць гадоў увайшоў у групу 251—300, перамясціўшыся з леташніх пазіцый 301—500. БДУ працягвае заставацца адзінай беларускай ВНУ, якая прадстаўлена ў міжнароднай рэйтынгавай табліцы.

QS GER бярэ пад увагу наступныя індыкатары: рэпутацыю ўніверсітэта сярод работадаўцаў, супрацоўніцтва ВНУ з работадаўцамі, прафесійныя дасягненні выпускнікоў, арганізацыю ўзаемадзеяння работадаўцаў са студэнтамі ВНУ і ўзровень працаўладкавання выпускнікоў.

Па паказніку «Узровень працаўладкавання выпускнікоў» БДУ займае 79-ы радок у свеце, а па індыкатары «Рэпутацыя ўніверсітэта сярод працадаўцаў» — 216-е месца.

Усяго ў гэтым годзе былі прааналізаваны даныя 679 самых вядомых ВНУ з 30 тысяч існуючых у свеце. Верхнія радкі ў рэйтынгу занялі Масачусецкі тэхналагічны інстытут, Стэнфардскі ўніверсітэт і Каліфарнійскі ўніверсітэт.

Сярод універсітэтаў краін СНД і найбліжэйшых суседзяў Беларусі ў рэйтынг трапілі 14 расійскіх універсітэтаў (лідзіруе Маскоўскі дзяржаўны ўніверсітэт з пазіцыяй у дыяпазоне 121—130), пяць казахскіх ВНУ (Нацыянальны ўніверсітэт Казахстана Аль-Фарабі 201—250), дзве ўстановы з Латвіі (Універсітэт Латвіі і Рыжскі тэхнічны ўніверсітэт у групе 201—250), дзве эстонскія ВНУ (універсітэт Тарту і Талінскі тэхналагічны ўніверсітэт у групе 301—500), тры літоўскія ўніверсітэты (Універсітэт Вільнюса 301—500), чатыры польскія

www.bsu.by

ВНУ (Варшаўскі ўніверсітэт 181—190), дзве ўкраінскія (Нацыянальны ўніверсітэт Кіева імя Т. Шаўчэнкі, 301—500).

Паводле сусветных рэйтынгаў, БДУ ўваходзіць у 1 працэнт найлепшых універсітэтаў свету. Ён прадстаўлены ў 10 глабальных і 7 прадметных рэйтынгах, але арыенцір трымае на «вялікую тройку». У QS Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт займае 295-е месца, у U.S.News — 367-е. У прадметным Шанхайскім рэйтынгу з беларускіх ВНУ прадстаўлены толькі БДУ, там ён размяшчаецца ў дыяпазоне 201—300.

Надзея НІКАЛАЕВА.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Кіраўнік СААЗ заявіў аб «жахлівай няроўнасці» ў доступе да вакцын ад коўіду

Краіны з нізкімі даходамі на душу насельніцтва атрымалі паўпрацэнта сусветнага аб'ёму вакцыны, а багатыя дзяржавы — больш за 75 %. Гэта сведчыць аб «жахлівай няроўнасці» ў доступе да вакцын, заявіў генеральны дырэктар Сусветнай арганізацыі аховы здароўя (СААЗ) Тэдрас Гебрэесус, выступаючы на Сусветным форуме лідараў, арганізаваным Калумбійскім універсітэтам, паведаміла ТАСС. Ён нагадаў, што СААЗ паставіла мэтай дамагчыся ахопу вакцынацыяй 40 працэнтаў насельніцтва ва ўсіх краінах да канца гэтага года і 70 % да сярэдзіны наступнага года. Гебрэесус падкрэсліў, што гэтую задачу можна вырашыць толькі ў тым выпадку, калі сваю частку работы выканаюць краіны і кампаніі, якія кантралююць глабальныя пастаўкі вакцын. Чым даўжэй захаваецца «вакцынавая няроўнасць» на планеце, тым больш будзе працягвацца сацыяльная і эканамічная бязладзіца, а ў каранавіруса будзе больш часу для цыркуляцыі і ператварэння ў больш небяспечныя варыянты, заўважыў кіраўнік СААЗ.

Больш чым 110 чалавек загінулі ў сутыкненні паміж бандамі ў эквадорскай турме

У выніку сутыкненняў паміж бандамі ў турме эквадорскага горада Гуаякіль загінулі 116 чалавек, больш за 80 атрымалі раненні. Пра гэта паведаміў прэзідэнт Эквадора Гільерма Ласа. Ён увёў надзвычайнае становішча ў пенітэнцыярнай сістэме краіны, дазволіўшы ўраду сярод іншых паўнамоцтваў накіроўваць у турмы паліцыю і салдат, паведаміла агенцтва Associated Press. Як заявіў Ласа на прэс-канферэнцыі, тое, што адбываецца ў Гуаякілі, стала «сумнай падзеяй», і пакуль ён не можа гарантаваць, што ўлады аднавілі кантроль над турмой. «Сумна, што турмы ператвараюцца злачыннымі групоўкамі ў тэрыторыі для спрэчак за ўладу», — сказаў ён. Раней афіцыйныя асобы заявілі, што цяперашняя вайна «ўспыхнула ў выніку барацьбы паміж вязнямі банд «Лос Лобас» і «Лос Чанерас» за права вяршэнстваваць у турме.

Прэзідэнт Паўднёвай Карэі прапанаваў абмеркаваць забарону на сабачае мяса

Мун Чжэ Ін прапанаваў падумаць аб увядзенні забароны на ўжыванне ў ежу сабак — традыцыйнага карэйскага далікатэсу, які ў апошнія гады губляе папулярнасць. Хоць для многіх прадстаўнікоў маладога пакалення гэтая тэма стала забароненай, на тэрыторыі краіны штогод забіваюць для вытворчасці мяса каля мільёна сабак. Сабачае мяса не ўваходзіць у штодзённы рацыён сярэднестатыстычнага карэйца, але яно па-ранейшаму карыстаецца папулярнасцю ў многіх пажылых людзей, якія лічаць яго карысным для здароўя. Акрамя таго, мяса сабак падаюць у традыцыйных рэстаранах, яго можна купіць на спецыялізаваных рынках. Да сённяшняга дня ўлады Паўднёвай Карэі ніколі не заяўлялі аб магчымай поўнай забароне на спажыванне гэтага прадукту.

Надвор'е

Першы месяц восені быў досыць халодны

На выхадныя ўначы замаразкі, а ўдзень — да 19 цяпла

Такога няўдалага верасня мы, напэўна, не бачылі гадоў дзесяць. Ён з першых дзён пачаў прымушаць нас насіць цёплую вопратку. А потым, упершыню ў гэтым месяцы, у гарадах уключылі ацяпленне. Як вынік — верасень па тэмпературным рэжыме аказаўся на 1-2 градусы халаднейшы, чым звычайна. На большай частцы тэрыторыі Беларусі гэты месяц быў шчодры на дажджы, месцамі выпала каля дзвюх месячных нормаў ападкаў. У рэкардсменах Пухавіцкі раён. Тут, на метэастанцыі ў Мар'інай Горцы, выпала 159 мм дажджу, што адпавядае 335 % вераснёвай нормы ападкаў. Але на гэтым тыдні дажджы ў многіх рэгіёнах спыніліся. Вобласць павышанага атмасфернага ціску будзе і далей кіраваць надвор'ем на большай частцы тэрыторыі нашай краіны, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

У выхадныя Беларусь застанецца пад уплывам заходняй перыферыі антыцыклону з цэнтрам над еўрапейскай тэрыторыяй Расіі. Чакаецца воблачна з праяснennямі. Пераважна без ападкаў. Ўначы і раніцай месцамі прагназуецца туман. Вецер паўднёва-ўсходні ўмераны, удзень парывісты. У суботу тэмпература паветра ўначы складзе плюс 1—8 градусаў, месцамі па ўсходзе краіны замаразкі ад нуля да мінус 2 градусаў. Удзень будзе 10—16 цяпла.

Стане крыху цяплей 3 кастрычніка. У нядзелю наогул не будзе замаразкаў. У гэтыя суткі ўначы чакаецца плюс 2—8 градусаў. Удзень паветра прагрэецца да плюс 11—17 градусаў, па паўднёвым захадзе аж да 19 цяпла. Пагадзіцеся, вось гэта нармальнае восенькае надвор'е, калі тэмпературны рэжым у асноўным адпавядае кліматычнай норме для першай дэкады кастрычніка.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у пачатку наступнага тыдня сітуацыя ў атмасферы істотна не зменіцца. Па-ранейшаму на большай частцы тэрыторыі краіны галоўным фактарам застанецца вобласць павышанага атмасфернага ціску ад антыцыклону над еўрапейскай тэрыторыяй Расіі. Таму ў панядзелак будзе пераважна без ападкаў. Вецер паўднёва-ўсходні ўмераны. Ўначы і раніцай месцамі чакаецца туман. Тэмпература паветра ўначы складзе плюс 3—10 цяпла. Удзень будзе наогул шыкоўна — ад плюс 13 да плюс 19 градусаў.

Сяргей КУРКАЧ.

Ну і ну!

12-гадовыя школьнікі... скралі мікрааўтобус

У аператыўна-дзяжурную службу Слуцкага РАУС паступіла паведамленне аб угоне мікрааўтобуса «Мерсэдэс-Бенц» у адной з вёсак. З паведамлення вынікала, што транспартны сродак знік некалькі хвілін таму.

На тэрыторыі раёна быў уведзены план «Перахоп». Усе нарады, якія неслі службу, былі накіраваны на вышук выкрадзенага аўтамабіля. Хуткія і рашучыя дзеянні слуцкіх міліцыянераў неўзабаве прынеслі станоўчы вынік. Як паведамляе УУС Мінскага аблвыканкама, скрадзены мікрааўтобус быў спынены нарадам ДПС. На немалое здзіўленне супрацоўнікаў, правапарушальнікамі аказаліся 12-гадовыя вучні мясцовай школы.

Як растлумачылі малалетнія зладзеі, пасля ўрокаў яны вярталіся дадому, па шляху ім трапіўся мікрааўтобус, дзверцы якога не былі зачынены. Цікаўныя школьнікі залезлі ў аўтамабіль, спадзеючыся разжыцца цыгарэтамі. Аднак тытунёвых вырабаў у машыне не аказалася, затое бестурботны гаспадар пакінуў ключы ў замку запальвання, чым і скарысталіся юныя шукальнікі адрэналіну. Хлопцы завялі аўтамабіль і паехалі па навакольлі. Нядоўгую паездку перапынілі супрацоўнікі ДАІ, якія прыбылі аператыўна.

Сяргей РАСОЛЬКА.

КЛОПАТ І ДАПАМОГА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

«Аддзяленні дзённага знаходжання вельмі папулярныя ў пажылых людзей, наведвае іх амаль 13 тысяч чалавек. Цэнтры займаюцца і вольным часам пажылых: гэта розныя гурткі, клубы па інтарэсах, дзе можна засвоіць навыкі, недаступныя раней, калі людзі былі занятыя працоўнай дзейнасцю, выхоўвалі дзяцей. А сёння гэта творчасць, фізкультура, здаровы лад жыцця, вывучэнне замежных моў і г. д.», — паведаміла Таццяна Фёдарава.

Асаблівую ўвагу ў цэнтрах сацыяльнага абслугоўвання ўдзяляюць лічбавай адукаванасці пажылых людзей. Для іх вельмі важная ўключанасць у гэтыя працэсы: карыстанне мабільным тэлефонам, інтэрнэтам і г. д. Лічбы пацвярджаюць, што пэўныя станоўчыя зрухі ёсць. Напрыклад, сотавай сувяззю карыстаюцца 98 % пажылых жанчын і 94 % пажылых мужчын, персанальным камп'ютарам — 36 % мужчын і 31,5 % жанчын.

Вялікую ролю ў павышэнні камп'ютарнай адукаванасці пажылых людзей адыгрываюць тэрытарыяльныя цэнтры сацыяльнага абслугоўвання, дзе працуюць камп'ютарныя клубы і вучаць карыстацца мабільнымі тэлефонамі і інтэрнэтам. Прыцягваюцца валанцёры, у тым ліку студэнты. ЮНФПА (Фонд ААН у галіне народанасельніцтва) і адзін з аператараў мабільнай сувязі распрацавалі дапаможнік для пажылых людзей, дзе даступнай, простай мовай напісана, як карыстацца ў мабільных тэлефонах інтэрнэтам, як шукаць неабходную інфармацыю. Больш за тое, цяпер у анлайн-рэжыме праводзіцца падрыхтоўка работнікаў тэрытарыяльных цэнтраў для таго, каб яны маглі навучаць гэтым навыкам пажылых людзей. Такая праца дае свой плён.

«Калі ў 2016-м толькі 18 % пажылых мужчын карысталіся інтэрнэтам, то ў 2020-м — ужо больш за 46 %, сярод пажылых жанчын таксама станоўчая дынаміка — з 16 % у 2016 годзе да 50 % у 2020-м», — адзначыла Таццяна Фёдарава.

Асаблівая ўвага — здароўю пажылых людзей. Прадстаўнік міністэрства расказала, што ў сувязі з неспрыяльнай эпідэміялагічнай сітуацыяй санаторыі разгарнулі асобную праграму санаторна-курортнага лячэння для пазачарговага аздараўлення тых, хто перанёс пнеўманію, асацыраваную з COVID-19. Каб атрымаць пуцёўку, трэба звярнуцца ў прадстаўніцтва Рэспубліканскага цэнтра па аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні насельніцтва не раней, чым праз месяц пасля выздараўлення. Такім правам з ліпеня мінулага года скарысталіся ўжо амаль дзве тысячы пажылых людзей і інвалідаў.

Каб зберагчыся ад цяжкіх наступстваў каранавіруса, **кіраўнік Рэспубліканскага гераналагічнага цэнтра (актыўнага даўгалецця), галоўны герыятр Міністэрства аховы здароўя Людміла ЖЫЛЕВІЧ** падчас прэс-канферэнцыі заклікала пажылых людзей прышчапіцца супраць COVID-19.

«Вакцынацыя дае магчымасць жыць. Таму мы просім нашых пажылых грамадзян вакцынавацца своечасова, каб яны маглі адчуваць усе фарбы жыцця», — сказала Людміла Жылевіч.

Яна звярнула ўвагу на тое, што Міністэрства аховы здароўя робіць усё магчымае, каб зберагчы здароўе пажылых людзей. Так, для своечасовага аказання медыцынскай дапамогі людзям шаноўнага ўзросту, якія жывуць у сельскай мясцовасці, ужо створаны спецыяльныя мабільныя брыгады, а таксама павялічана колькасць машын хуткай дапамогі. Практыкуюцца кансультаванне па тэлефоне і з дапамогай інтэрнэту. Тэлемедыцынскія тэхналогіі падключаны ў 262 арганізацыях аховы здароўя — яны дазваляюць урачу агульнай практыкі з рэгіёна хутка атрымаць параду спецыяліста любога ўзроўню.

Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.

Праект

АТРЫМЛІВАЕШ ДАХОД — ЗАПЛАЦІ ПАДАТАК

Самастойна занятыя тут не выключэнне

Як вядома, эксперты-распрацоўшчыкі з Міністэрства фінансаў рыхтуюць змены ў Падатковы кодэкс, якія могуць закрануць дзейнасць многіх індывідуальных прадпрымальнікаў. У аўторак на сайце Мінфіна быў апублікаваны праект гэтых змен. Дакумент досыць шырокі і складаецца з 186 старонак. Мы выбралі толькі самыя актуальныя пытанні.

АТРЫМЛІВАЦЬ «ШЭРЫЯ» ДАХОДЫ НЯВЫГАДНА

Першае, на што звяртае сваю ўвагу бізнес-супольнасць, — гэта адмена спрошчанай сістэмы (ССП) падаткаабкладання для індывідуальных прадпрымальнікаў (ІП), адвакатаў і натарыусаў (якія працуюць праз бюро). Такую адмену плануюць ажыццявіць з 2023 года. Але разам з тым ССП у памеры 6 % застанецца для юрыдычных асоб. Адзіны падатак для «індывідуалаў» таксама збіраюцца адмяніць праз год і тры месяцы. Як гэта будзе адбывацца, нам абяцалі растлумачыць на прыкладах у прэс-службе падатковага ведамства. Чакаем...

А цяпер нас больш цікавяць будучыя змены падатковага заканадаўства, якія датычацца непасрэдна насельніцтва. Дык вось, новы дакумент робіць значна больш жорсткімі меры па выкараненні так званых заробкаў у канвертах. Запланаванае змяненне закране тых фізічных асоб, у якіх выдаткі акажуцца вышэйшымі за даходы. У гэтым выпадку пасля праверкі такім парушальнікам з сумы перавышэння прыйдзецца выплаціць падатак у памеры 20 %.

УВЯДУЦЬ НОВАЕ ПАНЯЦЦЕ «ПРАФЕСІЙНЫ ДАХОД»

Па праекце дадзенага дакумента аб падаткаабкладанні прафесійны даход — даход фізічных асоб ад дзейнасці, пры вядзенні якой яны не маюць работадаўца і не прыцягваюць фізічных асоб па працоўных дагаворах і (або) па грамадзянска-прававых дагаворах, а таксама даход ад выкарыстання маёмасці. Па сутнасці, гэта той жа прыбытак самазанятых людзей.

Падатак на прафесійны даход будзе выплачвацца з даходаў фізічных асоб ад рэалізацыі тавараў і паслуг у нашай краіне. «Аднак такім падаткам не будуць абкладацца даходы, напрыклад, ад аказання паслуг, выканання работ па грамадзянска-прававых дагаворах (калі заказчыкамі выступаюць арганізацыі, у якіх дадзеныя людзі працавалі на працягу апошніх двух гадоў), ад прадпрымальніцкай, натарыяльнай, адвакацкай дзейнасці», — тлумачыць **падатковы кансультант Аксана КОВАЛЬ.** Стаўка такога падатку складзе 10 %, а з даходу, які перавысіў на працягу каляндарнага года 60 000 рублёў, — 20 %. Абкладацца падаткам на прафесійны даход будуць усе паступленні, у тым ліку і папярэдняя аплата, аванс і задатак.

Нагадаем, што ў самазанятых ёсць пералік абмежаванняў. Па заканадаўстве яны не могуць:

— наймаць супрацоўнікаў;

— весці дзейнасць, якая прадугледжвае рэгістрацыю ІП або юрыдычнай асобы;

— парушаць санітарныя нормы, якія прадугледжаны для дадзенага віду работ.

Пры гэтым замежныя грамадзяне і асобы без грамадзянства атрымаць дадзены статус не могуць. Поўны спіс відаў дзейнасці для самазанятасці ў нашай краіне ўключае некалькі дзясяткаў тыпаў работ. Гэта і продаж жывёл, раслін, кветак, расады, насення; а таксама харчовай прадукцыі ўласнага прыгатавання (хлебабулачныя і кандытарскія вырабы, гатовая кулінарыя); развядзенне кацянят і шчанюкоў

з наступнай рэалізацыяй; фота- і відэаздымка; музычная, танцавальная, акцёрская дзейнасць і іншае.

ЗМЕНЯЦЦА СТАЎКІ ПАДАТКУ ЗА ЗДАЧУ КВАТЭР У АРЭНДУ

Гэтым праектам з наступнага года запланавана нязначна павысіць стаўкі падаходнага падатку з фізічных асоб, якія здаюць жыллё ў арэнду (прыкладна на 2 рублі за пакой). Напрыклад, у Мінску цяпер за кожны пакой, які здаецца (незалежна ад эканамічнай зоны), трэба будзе заплаціць у наступным годзе 36,8 рубля за кожны месяц. У абласных цэнтрах за кожны пакой — 34,5 рубля падатку ў месяц. У такіх гарадах, як Баранавічы, Бабруйск, Барысаў, Жлобін, Жодзіна, Ліда, Мазыр, Маладзечна, Наваполацк, Орша, Пінск, Полацк, Рэчыца, Светлагорск, Слуцк і Салігорск, стаўка падатку за адзін пакой — 22,6 рубля. У іншых гарадах абласнога, раённага падпарадкавання і пасёлках гарадскога тыпу стаўка падатку за здачу ў арэнду кожнага пакоя жылой кватэры ў 2022 годзе — 16,6 рубля ў месяц.

Падрастуць у наступным годзе зямельны падатак і падатак на нерухомасць. Збор з уладальнікаў аграсядзіб у 2022 годзе падымуць да 31 рубля ў месяц (за сядзібу), а з 2024 года адменяць.

Сяргей КУРКАЧ.

На слыху

ПЕНСІЯ, РАСЦІ!

Выгоды новага механізму назапашвання грошай на жыццё ў старасці

На днях Прэзідэнт падпісаў Указ № 367 «Аб добраахвотным страхаванні дадатковай назапашвальнай пенсіі». Новы від пенсійнага страхавання — добраахвотнае страхаванне дадатковай пенсіі з фінансавай падтрымкай дзяржавы — запрацуе з 1 кастрычніка 2022-га.

www.pogovorim.by

Салідарная + накапляльная

Удзельнічаць у пенсійнай праграме могуць працоўныя грамадзяне, за якіх іх работадаўцы выплачваюць абавязковыя страхавыя ўзносы ў фонд сацыяльнай абароны насельніцтва. Аднак існуе абмежаванне для тых, каму да агульнаўстаноўленага ў Беларусі пенсійнага ўзросту засталося менш за тры гады. Пра тое, як будзе працаваць новы механізм, расказала **Наталля ПАЎЛЮЧЭНКА, першы намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны:**

— Работнік павінен пісьмова, асабіста ці анлайн звярнуцца да страхаўшчыка, якім, згодна з указам, вызначана прадпрыемства «Стравіта», і пацвердзіць сваё жаданне ўзяць удзел у праграме. Пасля гэтага работнік будзе штомесяц плаціць са свайго заробку пэўны тарыф накапляльнага ўзносу (ад 1 % да 10 %). Работадавец пры гэтым будзе абавязаны штомесяц выплачваць у «Стравіту» страхавы ўзнос на накапляльную пенсію свайго работніка суразмерна з тарыфам узносу, які той абраў для сябе, аднак не больш за 3 %. Важны момант для наймальніка: яго абавязковыя выплаты ў Фонд сацыяльнай абароны насельніцтва (ФСАН) за работніка (28-працэнтны ўзнос на пенсійнае страхаванне. — **«Зв.»**) паменшацца роўна на тую суму, якую ён пералічвае за работніка ў страхавую кампанію, так што нагрузка на работадаўца не павялічыцца. Аб'ём сродкаў, якія ён пералічваў за работніка ў ФСАН, застанецца на існуючым узроўні — ён проста падзеліцца паміж «Стравітай» і Фондам сацабароны.

Між тым, каб існуючая ў краіне салідарная сістэма (гэта калі пенсіянеру плацяць грошы, якія збіраюцца ў выглядзе пенсійных узносаў з тых, хто працуе зараз) не пацярпела, а фонд напаўняўся і ў яго бюджэце былі рэсурсы для фінансавання ўсіх расходаў (пенсій і розных дапамог), выпадаючыя такім чынам з фонду сродкі будуць кампенсавацца з рэспубліканскага бюджэту, падкрэсліла яна.

Суфінансаванне дзяржавы і змена працэнта

Выгада новай сістэмы ў тым, што добраахвотна выплачаныя грошы будуць назапашвацца, капіталізавацца і нават перадавацца ў спадчыну. Акрамя таго, у сувязі з выплатай узносаў на дадатковую назапашвальную пенсію работніку даецца льгота па падаходным падатку. А раз на год работнік пры жаданні зможа змяніць свой страхавы тарыф: павялічыць ці паменшыць працэнт выплат. Удзел у сістэме страхавання можна таксама перапыніць, напісаўшы заяву ў «Стравіту».

Назапашаныя да выхаду на пенсію сродкі чалавек зможа атрымліваць штомесяц як дадатак да існуючай цяпер у краіне пенсіі па ўзросце. Патраціць зберажэнні за пяць ці дзесяць гадоў пасля выхаду на пенсію — таксама права чалавека.

— Дзяржава гарантуе, што зароблена чалавекам працоўная пенсія па ўзросце захаваецца, незалежна ад таго, удзельнічаў ён у новай сістэме ці не. Добраахвотнае страхаванне — гэта прыступка ў развіцці пенсійнай сістэмы краіны. Перш чым сфарміраваць падыходы і прапановы да ўказа, мы вывучылі міжнародны вопыт і ўзялі найбольш паспяховыя практыкі. Сёння найбольш паспяховым механізмам лічыцца той, калі адбываецца суфінансаванне дзяржавы. Чалавек зацікаўлены тады, калі дзяржава падстаўляе яму плячо і фактычна нароўні з ім удзельнічае ў яго дадатковай накапляльнай пенсіі, — запэўніла Наталля Паўлючэнка. — Уклад чалавека памнажаецца ўдвая, калі ён добраахвотна выплачвае да 3 % у будучую пенсію, а з улікам капіталізацыі назапашаная дадатковая сума пенсіі ў выніку становіцца больш важкай.

Ірына СІДАРОК.

ХТО ТАКІЯ СКАМЕРЫ?

СЛАБАЕ ЗВЯНО

Паняцце «кіберзлачынствы» ўключае розныя катэгорыі правапарушэнняў. У прыватнасці, гэта крадзяжы з выкарыстаннем камп'ютарнай тэхнікі, злачынствы супраць інфармацыйнай бяспекі і некаторыя іншыя злачынствы, здзяйсненне якіх спалучана з парушэннем інфармацыйнай бяспекі. У адным выпадку чалавек перадае злаўмысніку рэквізіты банкаўскай карткі або доступ да інтэрнэт-банкінгу, і злачынец выкрадае грошы. У іншым — сам пацярпелы, уведзены ў зман, пераводзіць свае грошы зламыснiку.

— Для гэтага часцей за ўсё выкарыстоўваюцца прыёмы сацыяльнай інжынерыі — пралічваюцца мадэлі паводзін, прымяняюцца метады псіхалагічнага ўздзеяння, — распавядае спецыяліст.

Напрыклад, ашуканец прадстаўляецца супрацоўнікам банка і паведамляе «кліенту», што ў дадзены момант зламыснікі звяртаюцца да яго рахунку. З мэтай засцерагчы сродкі на рахунку чалавеку прапануецца назваць «супрацоўніку банка» рэквізіты банкаўскай карткі. Зразумела, першая думка ахвяры махлярства — захаваць свае грошы, і ён паведамляе злачынцу канфідэнцыяльныя звесткі.

— Банкаўскія сістэмы ў цэлым надзейныя і ўзломаўстойлівыя, — адзначае Уладзімір Іванавіч. — Большасць так званых кібермахлярстваў, якія рэгіструюцца сёння, не звязаныя з атакамі на самі сістэмы інфармацыйнай бяспекі. Гэта складана і патрабуе сур'ёзных ведаў, ды і навошта, калі ў любой, самай складанай банкаўскай сістэмы, заўсёды ёсць слабае звяно — і гэта сам кліент, трымальнік карткі.

СХЕМЫ ПАДМАНУ

Традыцыйны для вялізнай Расіі ашуканскі прыём тыпу «сваяк трапіў у бяду» для маленькай Беларусі не характэрны. Часцей за ўсё родныя-любімыя ў крокавай даступнасці, на крайні выпадак — некалькі гадзін язды.

— У нас самы распаўсюджаны сцэнарый махлярстваў — званкі або паведамленні ў месенджарах пад выглядам супрацоўнікаў банка, — распавядае Уладзімір Зайцаў.

«Даныя вашай банкаўскай карткі — яе нумар, тэрмін дзеяння, код CVV — маюць каштоўнасць, паколькі дазваляюць атрымаць доступ да рахунку і спісаць з яго грошы».

Адносна новы ашуканскі сцэнарый — званкі пад выглядам прадстаўнікоў праваахоўных органаў. Прынцып «разводу» той жа: для выяўлення махлярстваў, звязаных з банкаўскімі пераводамі, чалавеку прапануецца «паўдзельнічаць у міліцэйскай аперацыі». І трэба для гэтага ўсяго нічога — паведаміць «праваахоўнікам» інфармацыю аб вашай банкаўскай картцы, устанавіць нейкую праграму, перайсці па спасылцы...

— Зносіны могуць пераходзіць з тэлефона на месенджар, ашуканцы імкнуцца ўтрымаць чалавека на сувязі як мага даўжэй. Пакуль адзін зламыснік размаўляе па тэлефоне, другі сядзіць за камп'ютарам і тут жа выкарыстоўвае толькі што атрыманую інфармацыю для вываду грашовых сродкаў. Утрымліваючы вас на сувязі як мага даўжэй, зламыснікі дасягаюць некалькіх мэт. Па-першае, чым даўжэй вы размаўляеце, тым больш скажаце (у тым ліку таго, пра што не збіраліся казаць, напрыклад, агучыце інфармацыю аб банкаўскіх рэквізітах вашай карткі). Па-другое, ашуканцам важна, каб вы не пагатарылі з кім-небудзь з сяброў і сваякоў, больш дасведчаным і асцярожным, і не прынялі рашэнне блакіраваць банкаўскую картку.

На трэцім месцы па «папулярнасці» — гандлёвыя інтэрнэт-пляцоўкі, дзе ашуканцы звязваюцца з вамі пад выглядам прадаўца або пакупніка. Зламыснікі імкнуцца вывесці зносіны з патэнцыйным пацярпелым у пабочныя інтэрнэт-месенджары, каб служба бяспекі інтэрнэт-пляцоўкі не змагла адсачыць іх. Пад падставай залічэння невялікай сумы ў якасці задатку або аплаты паштовых паслуг па перасылцы тавару прапануецца перайсці па так званай фішынгавай спасылцы. Такая спасылка можа ўяўляць сабой копію інтэрнэт-банкінгу або арыгінальнага сайта службы дастаўкі. Вы ўводзіце банкаўскія рэквізіты сваёй карткі, і злачынцы атрымліваюць доступ да вашага рахунку.

Інтэрнэт не мае геаграфічных межаў — на нашых гандлёвых пляцоўках могуць «працаваць» ашуканцы суседніх дзяржаў, і беларускія зламыснікі таксама «ловяць» даверлівых кліентаў замежных інтэрнэт-крам.

— Яны проста адпрацоўваюць пэўную нішу і, як толькі прымаюцца дадатковыя меры бяспекі, пераарыентуюцца на іншыя пляцоўкі або схемы падману.

Новая схема ў «рэпертуары» ашуканцаў, пра якую нам распавялі чытачы: ашуканцы прадстаўляюцца супрацоўнікамі інтэрнэт-крам і паведамляюць, што на імя чалавека аформлена буйная пакупка ў крэдыт. Зразумела, той кажа, што адбылася памылка. І тады ў яго «ўдакладняюць» (нібыта каб «адмяніць аперацыю») інфармацыю, якая дае доступ да яго рахунку.

— Як часта вынаходзяцца новыя ашуканскія схемы?

— Хутчэй, яны мадыфікуюцца. Ашуканцы выкарыстоўваюць нейкую схему, яна папулярная і прыносіць прыбытак. Перастала прыносіць прыбытак — яе мадыфікуюць. Але сутнасць заўсёды нязменная.

Напрыклад, вам тэлефануе «банкаўскі супрацоўнік» з паведамленнем, што ваш карт-рахунак акурат цяпер узламалі. Вы адказваеце яму: «Я чуў пра вас, вы ашуканцы». «Што ж, — адказваюць вам. — Тады мы нічога не зможам зрабіць. Хай злачынцы здымаюць вашыя грошы, калі вы не супраць». І чалавек згаджаецца паведаміць даныя аб сваёй картцы. Нярэдка рэквізіты ў вас просяць не наўпрост, а прапануюць перайсці па дасланай спасылцы або ўстанавіць праграмнае забеспячэнне, якое (на самай справе) дае злачынцам аддалены доступ да прылады.

— Гэты апошні спосаб патрабуе ад зламыснікаў больш высокай ступені ведаў у сферы ІТ, — кажа суразмоўца. — Але прыкладна ў 80 % выпадкаў такія злачынствы нельга назваць высокаінтэлектуальнымі.

Іншы раз ашуканцы прапануюць даць банкаўскія рэквізіты, нібыта каб залічыць нейкую суму. Прычын шмат: выйгрыш у латарэю, вяртанне доўгу, падарунак і г. д. Чалавек думае: ну, калі што, уласныя ж грошы не страчу!

— У маёй практыцы быў выпадак, калі жанчына пазнаёмілася ў сетцы інтэрнэт з мужчынам. Паміж імі ўсталяваліся даверлівыя адносіны. Хоць асабіста яны не сустракаліся, жанчына была ўпэўненая, што ў іх каханне. У рэшце рэшт мужчына просіць даць рэквізіты рахунку, каб перавесці ёй буйную суму грошай. Але каб атрымаць іх, яна нібыта павінна аплаціць нейкі збор — перавесці невялікую суму на ўказаны ім рахунак. Жанчына прыйшла ў аддзяленне банка, і аказалася, што названы рахунак ёсць у базе даных службы бяспекі банка як ашуканскі. Дама выслухала засцярогі, перайшла праз дарогу, у іншае банкаўскае аддзяленне, і... перавяла са сваёй карткі «збор» на той рахунак, які назваў каханы. У выніку з яе карты спісаліся ўсе сродкі, а мужчына знік і больш на сувязь не выходзіў.

ХТО Ў ГРУПЕ РЫЗЫКІ?

— Ці можна вярнуць свае грошы, калі іх спісалі з рахунку зламыснікі?

— Не заўсёды, але можна. Ключавое пытанне — наколькі хутка вы звернецеся ў банк з мэтай блакіравання рахунку. Варта разумець: у распараджэнні ў вас літаральна хвіліна-дзве, тэлефанаваць у банк трэба неадкладна. Злачынцы адпрацоўваюць інфармацыю аб вашым карт-рахунку адразу ж, як толькі атрымліваюць. Хоць могуць і назапашваць яе з пэўнымі мэтамі — напрыклад, для наступнага продажу. Так, гэта свайго роду рынак. Даныя вашай банкаўскай карткі — яе нумар, тэрмін дзеяння, код CVV — маюць каштоўнасць, паколькі дазваляюць атрымаць доступ да рахунку і спісаць з яго грошы.

Дапусцім, зараз на вашай карце грошай няма, але яны паступяць — і ашуканцы дачакаюцца свайго часу. На мове праваахоўнікаў гэта называецца кампраметацыя звестак. Калі ваша картка скампраметаваная, яе лепш адразу ж заблакіраваць.

— Як махляры шукаюць сваіх ахвяр? Прынята лічыць, што баяцца кібераШуканцаў варта людзям заможным...

— «Мэтавыя» атакі больш кваліфікаваныя і прыносяць большы даход. Але «масавы сегмент» гэтых злачынстваў арыентаваны не на якасць, а на колькасць.

І ў гэтым выпадку злачынцаў цікавіць любая сума — нават дваццаць рублёў на карты пенсіянеркі. Бо ў дзень такая злачынная група здольная «апрацаваць» сотні людзей, і невялікія сумы паступова складаюцца ў вельмі буйныя даходы.

«У любой, самай складанай банкаўскай сістэмы, заўсёды ёсць слабае звяно — і гэта сам кліент, трымальнік карткі».

Тыя, хто займаецца гэтым відам махлярства, называюцца «скамеры» (ад англ. scam-падман), адзначае намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення па супрацьдзеянні кіберзлачыннасці. «Працуюць» ашуканцы злачыннымі групамі — мінімум 3-4 чалавекі. У адной такой групе могуць знаходзіцца грамадзяне розных дзяржаў. Першая ступень — гэта «дропы», якія выконваюць чарнавую работу. Яны ходзяць у банкамат здымаць грошы, рэгіструюць на свае імёны банкаўскія карткі. Яны больш за ўсіх рызыкуюць, бо іх даныя ёсць у банкаў. Частка «дропаў» — маргіналы, якія не разумеюць, у што ўвязаліся, але ёсць і тыя, хто свядома ідзе на рызыку. Гэтыя другія досыць хутка ўзнімаюцца па «кар'ернай лесвіцы»: неўзабаве ўжо самі набіраюць «дропаў» і кіруюць імі. Далей ідуць «воркеры» (менавіта яны прыводзяць патэнцыяльных «кліентаў», з імі пацярпелыя гутарылі па тэлефоне або ў месенджарах), хакеры, якія выводзяць вашы сродкі з рахункаў, і непасрэдна арганізатар. І калі «шараговыя супрацоўнікі» знаходзяцца пад ударам, то «вярхушка» прымае ўсе меры да таго, каб застацца ананімнымі. Яшчэ адна спецыялізацыя ў сферы камп'ютарных махлярстваў — так званыя «біты»: людзі, якія «адмываюць» выкрадзеныя грошы, пераводзячы іх у крыптавалюту і праводзячы праз ланцуг рахункаў і электронных кашалькоў.

«У нас самы распаўсюджаны сцэнарый махлярстваў — званкі або паведамленні ў месенджарах пад выглядам супрацоўнікаў банка».

ПРАВІЛЫ БЯСПЕКІ

Пра што варта памятаць, каб захаваць свае грошы?

• Тэлефанаваць у банк трэба адразу ж, як толькі вы зразумелі, што вас падманулі. Адмяніць аперацыю ў некаторых выпадках можна, нават калі грошы ўжо спісаліся з вашай карткі, кажа спецыяліст. Такім чынам, перш за ўсё вы тэлефануеце ў банк, потым — звяртаецеся ў міліцыю. Прычым у міліцыю трэба ўжо не тэлефанаваць, а ісці — з выпіскай руху грашовых сродкаў па рахунку, якую вам дадуць у банку.

• Калі вам «тэлефануюць з банка», сапраўднага супрацоўніка ад фальшывага адрозніць нескладана. Ні адзін спецыяліст банкаўскай сферы не папросіць вас даць яму канфідэнцыяльную інфармацыю (нумар карты, яе рэквізіты і нават звесткі аб тым, кліентам якога банка вы з'яўляецеся). Па-першае, таму што гэта банкаўская тайна, а па-другое, рэальны супрацоўнік банка апрыёры валодае гэтай інфармацыяй або мае магчымасць яе ўдакладніць без вашай дапамогі. І ў цэлым, як толькі ў вас па тэлефоне «спецыяліст» (кім бы ён ні прадставіўся) стаў прасіць рэквізіты карты, ведайце: гэта махляр.

• Больш за 80 % усіх падобных злачынстваў пабудаваныя менавіта на псіхалагічнай уразлівасці. Не давайце ніякай канфідэнцыяльнай інфармацыі незнаёмым людзям, не пераходзьце па любых атрыманых ад іх спасылках. Зайдзіце ў пошукавую сістэму і не палянуйцеся набраць запыт, каб перайсці на афіцыйную старонку патрэбнай вам арганізацыі, а не на яе фішынгавы аналаг. Ператэлефануйце ў банк або іншую арганізацыю і ўдакладніце інфармацыю, якую вам паведамілі па тэлефоне.

• Памятайце, што для доступу да рахунку можна выкарыстоўваць не толькі картку, але і проста яе рэквізіты.

• Не захоўвайце паролі ад мабільных банкаў у тэлефоне: лепш лішні раз набраць пароль, чым страціць грошы. Акрамя таго, паролі варта час ад часу мяняць.

— У банкаўскіх дадатках, як правіла, існуе двухфактарная ідэнтыфікацыя. І мая парада — выкарыстоўваць усе гэтыя спосабы, а не адключаць іх. Здаецца, што нязручна кожны раз уводзіць пароль, прыкладваць палец або выкарыстоўваць іншую біяметрыю. Але калі з вашага тэлефона доступ у асабісты кабінет у мабільным банку адкрываецца па замоўчванні, гэта найгрубейшае парушэнне правіл інфармацыйнай бяспекі.

• Не варта выкарыстоўваць зарплатную картку (або картку, дзе вы захоўваеце грошы) для разлікаў у сетцы інтэрнэт. Бяспечней мець для гэтага асобную картку і пераводзіць на яе пэўную суму непасрэдна перад пакупкай. Тое ж самае датычыцца паездак за мяжу — для разлікаў там завядзіце асобную картку.

• Аналагічная сітуацыя з электроннымі паштовымі скрынямі. Мы прывязваем паштовыя скрыні і нумары тэлефона да тых ці іншых інтэрнэт-рэсурсаў. Гэтыя рэсурсы могуць узламаць, ёсць нядобрасумленныя супрацоўнікі гандлёвых інтэрнэт-пляцовак, якія збіраюць інфармацыю аб пакупніках. Бяспечней выкарыстоўваць розныя е-мэйлы для асабістай і дзелавой перапіскі, рэгістрацыі ў сацсетках і інтэрнэт-банкінгу. І тады вы будзеце дакладна ведаць, што гэтая апошняя паштовая скрыня скампраметавана не будзе.

Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

СВЯТАЯ РАДАСЦЬ

На Гродзеншчыне прадставілі новы турыстычны маршрут

Са школьных урокаў гісторыі вядома, што адна з самых яркіх асаблівасцяў Беларусі — яе шматканфесійнасць. Гэта ж і прадвызначала наш менталітэт: верацярпімасць, уменне сябраваць, прымаць розных людзей такімі, якія яны ёсць, добразычлівасць. Стагоддзямі людзі розных веравызнанняў мірна жылі на Беларусі. І сёння, у час, калі свецкія правілы пераважаюць над рэлігійнымі, кожнаму беларусу варта бліжэй знаёміцца з духоўнай спадчынай сваёй краіны. Як мінімум для таго, каб адчуць яе непаўторнасць.

А каб сэканоміць час на пошукі славутасцяў, арганізацыю маршрутаў, экскурсаводы Святлана Чувак і Віталь Карнялюк распрацавалі адпаведны турыстычны маршрут «Святая радасць Беларусі: канфесіянальная Навагрудчына». Ён быў прадстаўлены супрацоўнікам турфірмаў, экскурсаводам, журналістам падчас выязнога семінара, арганізаванага Нацыянальным агенцтвам па турызме. «Звязда» не магла пакінуць гэта без увагі.

Варта адразу адзначыць, што да такіх экскурсій трэба рыхтавацца і самім турыстам. Па-першае, асвяжыць у памяці гісторыю Беларусі ці хоць бы Гродзенскай вобласці. Па-другое, напярэдадні... выспацца. Маршрут уключае 17 пунктаў, таму лёгка не будзе, а пазнавальна — будзе адзначна.

І ХЛЕБ, І ДА ХЛЕБА

Першы пункт экскурсіі — беларускі аграгарадок Шчорсы і яго жамчужына, царква Святога Дзмітрыя Салунскага. Як расказаў настаяцель храма Дзмітрый Пачабут, у Шчорсах 100 працэнтаў насельніцтва праваслаўныя. Афіцыйна ў гістарычных крыніцах Шчорсы згадваюцца ў XV стагоддзі як уладанне роду Храптовічаў. Але ў 1386 годзе тут ужо была драўляная царква святога Дзмітрыя Салунскага, дзе захоўвалася цудадзейная ікона вялікапакутніка. Аб гэтым сведчыць надпіс «1386» на рызе іконы. Паданне сцвярджае, што гэту ікону ахвяраваў адзін з заснавальнікаў роду Храптовічаў як падзяку за сваё цудоўнае выратаванне ў няўдалай бітве з татарамі. Ікона была вывезена падчас вайны 1812 года, але ёсць звесткі, што пасля яна вярнулася ў Шчорсы. Канчаткова яе след губляецца падчас Першай сусветнай вайны.

У 1758 годзе драўляная царква згарэла. А ў 1776-м дзякуючы Іакіму Храптовічу на яе месцы з'явіўся новы цагельны храм, пабудаваны італьянскімі архітэктарамі Джузэпэ дэ Сака і Карла Спампані. Удзел італьянскіх архітэктараў прадвызначыў незвычайны для Беларусі выгляд праваслаўнага храма. Звонку ён нагадвае карабель, а ўнутры здзіўляе пышнай каланадай. У канцы 1950-х гадоў храм пераўтварылі ў спартзалу і зернесклад. Усе іконы, усе рэчы, архівы былі вывезены. Частка была знішчана, частку змаглі выратаваць мясцовыя жыхары. І калі ў 1988 годзе храм вярнулі вернікам, яны прынеслі ўсё, што захоўвалі. На жаль, не захавалася ніякай інфармацыі аб тым, як царква выглядала да закрыцця. Але як можа разгарнуцца фантазія яе наведвальнікаў!

Тым, хто шукае спакою і яднання з прыродай, варта наведаць Свята-Елісееўскі Лаўрышаўскі мужчынскі манастыр у вёсцы Гнесічы. Гэта месца — сапраўдная карціна гісторыі на фоне прыроды. Манастыр, заснаваны каля 1225 года, размясціўся пад шатамі векавых сосен на беразе велічнага Нёмана. Яго заснавальнік, прападобны Елісей, мог бы зрабіць добрую кар'еру пры дварэ вялікага князя Міндоўга. Але свецкае жыццё было яму не па душы, і, аддаўшы сябе служэнню Богу, ён заснаваў мужчынскі манастыр, які з часам стаў лаўрай. У 1250 годзе Елісей быў забіты беснаватым паслушнікам, які пасля вылечыўся, дакрануўшыся да мошчаў Елісея. Айцец Яўген расказвае, што і ў наш час асабліва праведныя манахі зранку могуць убачыць высокую постаць святога Елісея, які аглядае манастырскую тэрыторыю.

Сёння ў манастыры жывуць дзевяць манахаў. І шматпакутная абіцель перажывае сваё чацвёртае адраджэнне. Ужо гатовы дом міласэрнасці, дзе могуць жыць паломнікі і ўсе ахвотныя вырашыць свае духоўныя праблемы ў святым месцы, адрамантавана царква. А самы грандыёзны праект — ідэя пабудаваць вакол манастыра 33 капліцы (па гадах жыцця Ісуса Хрыста). Кожная будзе мець практычнае значэнне і духоўны сэнс. Сёння ўжо пабудавана сем капліц...

Наведвальнікі манастыра не застануцца галоднымі ні духоўна, ні фізічна. Тут наладжана самастойная вытворчасць хлеба. За аснову ўзята тэхналогія з Афона. У царкоўны алтар уносіцца закваска, якая падымаецца падчас літургіі. Звычайна, каб вырасціць закваску, патрабуецца пяць дзён, у царкоўным алтары яна расце за суткі. Усяго ў манастыры вырабляюць восем відаў хлябоў.

НАМАГАННЯМІ СЛУЖКАЎ І ПРЫХАДЖАН

Пасля набыцця духоўнага спакою атрымаць пазітыўныя эмоцыі можна каля сцен Любчанскага замка, аднаго з апошніх помнікаў традыцыйнага замкавага будаўніцтва ў Беларусі. Тут гасцей сустракае сапраўдная ключніца, якая не шкадуе легенд і цікавых фактаў і дасць майстар-клас па танцах. Пачалі будаваць замак у 1581 годзе, а скончылі ў пачатку XVII стагоддзя. Велічны замак стаяў на высокім беразе Нёмана. У XVII стагоддзі, дзякуючы гаспадарам Радзівілам, у Любчы кіпела жыццё — працавала найбуйнейшая ў Беларусі друкарня, дзейнічаў кальвінісцкі сабор. Сёння сваёй манументальнасцю здзіўляюць асобныя часткі ансамбля. Хочацца верыць, што ў хуткім часе адрэстаўрыраваны Любчанскі замак будзе прымаць мноства турыстаў.

Сам Навагрудак — жывы прыклад шматканфесійнасці ў Беларусі. Стагоддзямі тут разам жывуць праваслаўныя, католікі, мусульмане, яўрэі. Адметнасць горада — касцёл Святога архангела Міхаіла. Свой пачатак ён бярэ з XVII стагоддзя, калі па ініцыятыве літоўскага ваяводы Хрыстафора Хадкевіча ў Навагрудак прыехалі айцы-дамініканцы. У 1624 годзе для іх быў пабудаваны манастыр і драўляны касцёл пры ім. Пасля касцёл некалькі разоў мяняў свой выгляд і прызначэнне.

Святы архангел Міхаіл лічыцца нябесным заступнікам Навагрудчыны. Як расказаў ксёндз Юрый Жэгарын, святы неаднаразова паказваў жыхарам сваю прысутнасць у горадзе і клопат аб ім. Першы падобны цуд здарыўся падчас руска-польскай вайны, калі архангел з'явіўся рускаму ваяводу Івану Хаванскаму, які ішоў на Навагрудак. Горад тады ніхто не краваў.

Знакавым для многіх дзеячаў беларускай гісторыі стаў і касцёл Праабражэння Гасподняга (Фарны касцёл). Мяркуецца, што храм быў закладзены ў 1395 годзе князем Вітаўтам. У 1422-м тут вянчаліся польскі кароль Уладзіслаў II (Ягайла) і князёўна Соф'я Гальшанская. У 1799 годзе ў Фарным касцёле хрысцілі пісьменніка Адама Міцкевіча, чыё імя назменна асацыіруецца з Навагрудкам.

За гады свайго існавання касцёлы значна пацярпелі. Але цяпер намаганнямі служкаў і прыхаджан яны яркія славутасці горада, абавязковыя для наведвання гасцямі Навагрудка.

У Фарным касцёле захоўваецца каталіцкі варыянт вельмі важнай іконы — Божай Маці Навагрудскай. Ёсць у горадзе і праваслаўны варыянт гэтай іконы, убачыць яго можна ў царкве Святых Барыса і Глеба, пабудаванай у 1519 годзе. Царква аб'ядноўвае два архітэктурныя стылі — познюю готыку і рэнесанс. У 1960-х археолагі знайшлі пад царквой старажытнарускі храм XII стагоддзя, які добра захаваўся.

Дарэчы, Навагрудак — адзін з нямногіх беларускіх гарадоў, дзе ёсць мячэць. Яе пабудавалі ў 1855 годзе. Цікавы факт: на беларускіх землях усе мячэці будаваліся толькі з дрэва. У 1939 годзе яе закрылі, доўгі час тут быў жылы дом на шэсць кватэр. Адкрыццё адноўленай мячэці ў 1997 годзе стала падарункам да 600-годдзя пражывання татар на землях Беларусі. Навагрудская мячэць адзіная ў краіне, дзе на ўвесь горад гучыць азан — заклік да малітвы.

Пра яўрэйскі след у Навагрудку сведчыць музей яўрэйскага супрацівлення. У часы ваеннага ліхалецця тут былі баракі працоўнага лагера. За чатыры месяцы вязні выкапалі тунэль, дзякуючы якому выратаваліся 250 чалавек.

НЕ ТОЛЬКІ ЦІКАВА, АЛЕ І КАМФОРТНА

Сапраўдны майстар-клас па развіцці рэлігійнага турызму можа даць Віталь Цыбульскі, ксёндз касцёла Святога Казіміра ва Уселюбе. Гэты храм цікавы сам па сабе. Пабудаваны ў 1433 годзе, ён лічыцца найстарэйшым касцёлам на Беларусі. Вылучаецца і архітэктурнымі асаблівасцямі: сумяшчае скандынаўскую і ўсходнееўрапейскую готыку. Свой росквіт касцёл набыў у 1820 годзе, калі Уселюбам сталі валодаць О'Руркі — першыя прамыя нашчадкі першых хрысціянскіх каралёў Ірландыі. У 1947 годзе касцёл пераўтварылі ў зернясховішча, затым — у спартыўную залу. У 1962 годзе ён быў наўмысна падпалены па загадзе мясцовых улад. У спаленым выглядзе храм прастаяў да 1986 года, пакуль ім не зацікавіліся гісторыкі.

З-за ўсіх складанасцяў лёсу і страт сёння ў касцёле вельмі мала старажытных рэчаў. Але паломнікам, турыстам тут будзе цікава. Жамчужына касцёла — скульптура Божай Маці Новага жыцця, адзіная ў свеце. Да яе звяртаюцца з просьбамі аб нараджэнні дзіцяці. Побач з касцёлам можна прайсціся па імправізаванай даліне Эйн-Керэм. Па паданнях, менавіта ў гэтай даліне цяжарная Дзева Марыя сустрэлася з цяжарнай Лізаветай, маці Іаана Хрысціцеля.

Для таго каб людзям было камфортна знаёміцца з Уселюбам, на тэрыторыі касцёла працуюць кавярня, дом для гасцей, ёсць нават месца для барбекю.

«Мая задача як святара — прыводзіць людзей у свет Бога, адкрываць яго ім. І чалавек, які бачыць, што яму рады, што аб ім клапоцяцца, прыме гэта. Само паняцце рэлігійнага турызму мае пачатак з паломніцкага руху, калі людзі прыязджалі, каб убачыць культавы аб'ект, а потым успрымалі яго як духоўную частку свайго жыцця», — сказаў Віталь Цыбульскі.

Калі ўдумацца ў тое, які пласт беларускай гісторыі і культуры падымаецца падчас гаворкі пра кожны храм у гэтых мясцінах, выснова напрошваецца сама. Патэнцыял у рэлігійнага турызму не проста ёсць — ён чакае, калі на яго зверне ўвагу як мага больш беларусаў.

Валерыя СЦЯЦКО.
Фота Аліны МАЗАВЕЦ.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

1 кастрычніка 2021 г. № 38 (623)

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

ПАМЯЦЬ

Фота з архіва Галіны БЯЛЯЕВАЙ.

АБУДЗІЦЬ УСПАМІНЫ...

Магілёўскія дэпутаты сабралі для кнігі аб вайне сапраўдныя гісторыі відавочцаў і іх нашчадкаў

З VI Усебеларускага народнага сходу завуч магілёўскай школы № 34 Галіна Бяляева вярнулася акрыленая. У душу запала фраза пра тое, што павінна быць нешта, што ўсіх нас аб'яднае. Гісторык па адукацыі і адна з актыўных дэпутатаў Магілёўскага гарсавета, яна ведала, што гэтай тэмай павінна стаць Вялікая Айчынная вайна. «Некаторыя народы прыдумваюць сабе нешта значнае, каб было чым ганарыцца, а мы, нашчадкі пераможцаў, шукаем нейкую ідэю, — разважае яна. — Бяда не абмінула ніводную сям'ю. Боль і цяпер жыве ў нашым сэрцы. Трэба толькі гэтыя ўспаміны абудзіць».

18 стар.

ПАРАДАК-2030

Голас моладзі для зялёнай будучыні

Маладыя беларусы маюць магчымасць падключыцца да распрацоўкі Нацыянальнага плана дзеянняў па развіцці «зялёнай» эканомікі.

Аб гэтым заявіў намеснік старшыні Савета Рэспублікі, Нацыянальны каардынатар па дасягненні Мэт устойлівага развіцця Анатоль Ісачанка падчас адкрыцця маладзёжнага форуму «Зялёная» эканоміка — паспяховая будучыня».

Віцэ-спікер Савета Рэспублікі падкрэсліў: менавіта маладым людзям трэба будзе вызначаць будучыню нашай краіны.

— Для нас, старэйшага пакалення, важна, каб сучасная беларуская моладзь стала прыхільнікам асноўных прынцыпаў устойлівага развіцця. Падобны падыход — гэта жаданне захаваць той шлях, які абраў чвэрць стагоддзя таму беларускі народ, — цытуе словы Анатоля Ісачанкі прэс-служба верхняй палаты парламента.

На думку намесніка Старшыні Савета Рэспублікі, «зялёная» эканоміка з'яўляецца адным з прыярытэтных кірункаў развіцця многіх дзяржаў у свеце.

— У Беларусі гэтаму пытанню таксама ўдзяляецца значная ўвага. Яркім пацвярджэннем з'яўляецца наяўнасць школ з «зялёным ухілам», — падкрэсліў Нацыянальны каардынатар па дасягненні Мэт.

Парламентарый таксама лічыць, што беларусам неабходна змяніць свой лад мыслення і зберагчы прыроду краіны.

— У гэтым працэсе важную ролю адыгрывае менавіта моладзь, — падсумаваў ён.

Удзельнікі маладзёжнага форуму на працягу двух дзён удзельнічалі ў рабоце дыялогавых пляцовак па прыярытэтных кірунках праекта Нацыянальнага плана дзеянняў па развіцці «зялёнай» эканомікі на 2021—2025 гады і панэльных дыскусіях «Голас моладзі для зялёнай будучыні».

Вольга АЛЯКСАНДРАВА.

ДУХОЎНАСЦЬ

Наталля КАЧАНАВА:

«У Полацку — наша дзяржаўнасць, вытокі, духоўнасць і карані»

У Полацкім Спаса-Ефрасіннеўскім жаночым манастыры прайшло першае пасяджэнне ўсіх зацікаўленых бакоў па тэме падрыхтоўкі да святкавання 900-годдзя манастыра, якое пройдзе ў 2025 годзе.

На нарадзе, у якой прыняла ўдзел Старшыня Савета Рэспублікі Наталля Качанава, вызначылі пералік мерапрыемстваў і работ, што неабходна правесці ў якасці падрыхтоўкі да свята.

Спікер верхняй палаты парламента адзначыла, што 900-годдзе манастыра — важная дата для беларусаў:

— У Полацку — наша дзяржаўнасць, вытокі, духоўнасць і карані, — акцэнтавала яна ўвагу. — Па просьбе Беларускай праваслаўнай царквы дзяржава перадала манастыру ва ўласнасць шэраг будынкаў. Плануецца, што тут будзе гасцініца для паломнікаў, бо сюды прыязджае вялікая колькасць людзей з розных краін.

Наталля Качанава падкрэсліла: існуючыя ўмовы не дазваляюць у поўнай меры забяспечыць камфортнае знаходжанне турыстаў і паломнікаў, таму трэба вызначыць найбольш важныя аб'екты, якія неабходна рамантаваць і будаваць у першую чаргу.

У сваю чаргу старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў Уладзімір Цярэнцьеў паведаміў, што сярод першых аб'ектаў (акрамя гасцініцы) будзе пабудавана новая трапезная. У найбліжэйшы час падрыхтуюць праектна-каштарысную дакументацыю, а самі работы распачнуцца вясной 2022-га.

— Пакуль асноўная задача — гэта два аб'екты: гасцініца і трапезная, — удакладніў старшыня абласнога Савета дэпутатаў. — Таксама на базе перададзенага пяціпавярховага корпуса, які адыдзе ад Полацкага дзяржаўнага ляснога каледжа, плануецца стварыць вялікую бібліятэку і музей. Гэта будзе не проста комплекс для сясцёр, але і гісторыка-культурны цэнтр.

Фінансаванне работ плануецца з мясцовага, абласнога і рэспубліканскага бюджэтаў, таксама разлічваюць і на дапамогу мецэнатаў. Ужо налета на рэстаўрацыйныя работы ў Спаса-Праабражэнскай царкве (першы храм Ефрасіннеўскага манастыра) вылучаць мільён рублёў. Аб гэтым заявіў міністр культуры Анатоль Маркевіч. Ён адзначыў, што сёлета на рэканструкцыю ўжо было выдзелена 915 тысяч рублёў.

— Сумы вялікія, але гэта таго варта, бо Спаса-Праабражэнская царква — жамчужына нашай краіны, — перакананы міністр культуры. — Царква ўнікальная сваёй гістарычнай значнасцю і тымі работамі, якія трэба правесці.

Паводле слоў міністра, завяршыць рэканструкцыю Спаса-Праабражэнскага храма плануецца ў 2024 годзе.

— Аднак спяшацца тут нельга, паколькі мы не маем права зрабіць нешта не так на святым аб'екце, — перакананы Анатоль Маркевіч. — Кожны крок вывяраецца, ідзе сур'ёзнае навуковае суправаджэнне. Прамашкі тут недаравальныя. Дзяржава ўкладвае немалыя грошы ў рэстаўрацыю храма. Цяпер раскрыта менш за 50 працэнтаў фасада, рамантуецца дах. Напярадзе яшчэ шмат работы.

НАША ДАВЕДКА

Спаса-Ефрасіннеўскі манастыр быў заснаваны каля 1125 года прападобнай Ефрасінняй Полацкай, яе мошчы знаходзяцца тут.

Да 1161 года на месцы драўлянай была пабудавана каменная Спаса-Праабражэнская царква. У ёй захаваліся ўнікальныя фрэскі XII стагоддзя. Зараз ідзе рэстаўрацыя храма.

У 1882 годзе над уваходам у манастыр узвялі званіцу, у канцы XIX стагоддзя тут пабудавалі яшчэ і Крыжаўзвіжанскі сабор.

Архітэктурны ансамбль манастыра ўнесены ў Спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў Беларусі.

Вольга АЛЯКСАНДРАВА.

АКТУАЛЬНА

Таццяна РУНЕЦ:

«Канстытуцыя павінна закласці трывалы падмурак развіцця грамадства»

Член Канстытуцыйнай камісіі, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах:

— На пасяджэнні Канстытуцыйнай камісіі з удзелам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь разглядаліся прапановы ў асноўны дакумент нашай краіны — Канстытуцыю, змены ў якую трэба будзе вынесці на ўсенароднае абмеркаванне і рэферэндум у лютым наступнага года.

Асабліва хачу падкрэсліць, што распрацаваныя Канстытуцыйнай камісіяй прапановы па змене Канстытуцыі краіны павінны паслужыць далейшаму ўдасканаленню грамадства і дзяржавы і стаць тым надзейным прававым падмуркам, на якім трэба будзе развівацца дэмакратычнай, сацыяльнай дзяржаве.

Работа над зменамі Асноўнага Закона краіны была праведзена вялікая і сур'ёзная. Улічваліся прапановы як грамадзян, так і членаў самой камісіі. У агульнай складанасці змены закрануць 53 артыкулы з 146 існуючых. Пры гэтым з'явяцца 14 новых артыкулаў.

У новай рэдакцыі Канстытуцыі прапаноўваецца захаваць прэзідэнцкую форму праўлення, аднак будуць удакладнены і выразна размежаваны функцыі і паўнамоцтвы Прэзідэнта, парламента, урада. Таксама будзе вызначаны статус Усебеларускага народнага сходу як канстытуцыйнай формы народаўладдзя. Пры гэтым асноўная задача — не дапусціць двоеўладдзя. УНС павінен стаць такім інстытутам народнага прадстаўніцтва, які будзе вызначаць развіццё нашай краіны і прымаць лёсавызначальныя рашэнні на важных этапах будаўніцтва дэмакратычнай, сацыяльнай і прававой дзяржавы. Зрэшты, варта адзначыць, што члены Канстытуцыйнай камісіі пакуль не дасягнулі кансэнсусу па статусе і паўнамоцтвах Усебеларускага народнага сходу.

Новаўвядзенні ў Асноўны Закон закранулі і актуальныя на сёння гендарныя складнікі. Мяркуецца ўвядзенне артыкула, дзе будзе дакладна вызначана паняцце шлюбу як саюза мужчыны і жанчыны. Тым самым замацоўваюцца традыцыйныя сямейныя і маральна-этычныя каштоўнасці.

Упэўненая, што абноўленая Канстытуцыя закладзе трывалы падмурак, які дазволіць паспяхова развівацца грамадзянскай супольнасці нашай краіны, а таксама выразна скаардынуе для большай эфектыўнасці дзейнасць розных органаў дзяржаўнага кіравання.

АКЦЭНТЫ

Духоўнасць і прыгажосць беларускай зямлі

адлюстраваны на выстаўцы ў Нацыянальным мастацкім музеі

Такім меркаваннем падзялілася з журналістамі спікер Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА.

Яна прыняла ўдзел ва ўрачыстым адкрыцці выстаўкі ў Нацыянальным мастацкім музеі, дзе дэманструюцца работы ўдзельнікаў VI Міжнароднага мастацкага пленэру «Святасць зямлі беларускай», прысвечанага памяці мітрапаліта Філарэта і Году народнага адзінства. У мерапрыемстве таксама прыняў удзел Дзяржаўны сакратар Саюзнай дзяржавы Дзмітрый Мезенцаў.

Адзначым, што Міжнародны мастацкі пленэр стаў знакавай падзеяй у духоўным, культурным і мастацкім асяроддзі, але і садзейнічаў яднанню нацыі.

— Я ўражана, што ў кароткі перыяд часу можна стварыць такія цудоўныя работы, — адзначыла Наталля Качанава ў гутарцы з журналістамі. — На мой погляд, тут паказана духоўнасць, адлюстравана прыгажосць беларускай зямлі, аблічча нашага паважанага Уладыкі Філарэта.

Спікер верхняй палаты парламента акцэнтавала ўвагу на таленце маладых мастакоў:

— Для таго каб стварыць такую работу, патрэбны не проста ўменне і талент, але яшчэ і духоўнасць. Павінны быць у душы светлыя пачуцці, — лічыць яна. — Гэта ўсё разам дапамагло стварыць выдатныя творы, якія будуць радаваць беларусаў.

Старшыня Савета Рэспублікі пераканана, што выстаўка павінна быць даступная для шырокага кола гледачоў, і выдатна, калі яе змогуць убачыць у іншых гарадах краіны, а не толькі ў сталіцы.

Гаворачы пра асобу мітрапаліта Філарэта, спікер верхняй палаты парламента падкрэсліла:

— Гэта багаслоў, святар, але гэта яшчэ і цудоўны чалавек, герой Беларусі, які рабіў усё для таго, каб аб'ядноўваць нас, каб

наша краіна была мірная, спакойная і заклікаў нас да гэтага. Я не адчуваю, што яго няма з намі. Таму што пры ўсёй яго шматграннасці ён умеў дайсці да кожнага чалавека: кожны мог знайсці пры размове з Уладыкам усё тое, што ён хацеў пачуць. Ён разумеў і любіў кожнага. Таму мы павінны прытрымлівацца запаветаў нашага глыбокапаважанага мітрапаліта Філарэта, першага Экзарха ўсяе Беларусі, — рэзюмавала Наталля Качанава.

Нагадаем, што мітрапаліт Філарэт быў адным з тых, хто сваёй падзвіжніцкай дзейнасцю аб'ядноўваў беларускі народ, абапіраючыся на сапраўдныя духоўныя, маральныя, культурныя, патрыятычныя і маральныя каштоўнасці.

Вольга АНУФРЫЕВА.

Сацыяльная абарона без межаў

Анлайн-сустрэча работнікаў сацыяльных службаў прыгранічных Віцебскай і Смаленскай абласцей стала пляцоўкай для агучвання перадавога вопыту. Мерапрыемства мела назву «Сацыяльная абарона — адзінства, падтрымка і дапамога».

Мадэратарам выступіў намеснік старшыні Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў, кіраўнік камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Віцебскага аблвыканкама Аляксандр Хрыстафораў. Сярод удзельнікаў — і іншыя народныя выбраннікі.

Часовыя абмежаванні на сустрэчы з-за чарговай хвалі COVID-19 не праблема, падкрэслівалі спікеры. Тым больш што яны ўсё роўна працягваюцца. У прыватнасці, не спыняецца прыём у санаторыях Прыдзвінскага краю на аздараўленне смалян і жыхароў рэгіёна. Нашы «кузні здароўя» вельмі папулярныя, асабліва ў расійскіх ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны. Яны нават у чэргі запісваюцца, каб зноў пабываць у Беларусі.

Дарэчы, у сваю чаргу нашых спецыялістаў зацікавіла практыка стварэння расіянамі спецыяльных устаноў для ветэранаў, дзе яны маюць магчымасць правесці вольны час, сустрэцца з цікавымі людзьмі, навучыцца карыстацца камп'ютарам і інтэрнэтам.

Намеснік старшыні камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароны Віцебскага аблвыканкама Вера Астапенка адзначыла вельмі плённае ўзаемадзеянне ў рамках створанай міжнароднай метадычнай школы, у якой пастаянна вядзецца абмен вопытам і найноўшымі методыкамі. Напрыклад, Дэпартамент Смаленскай вобласці па сацыяльным развіцці вельмі цікавіць беларуская нацыянальная стратэгія «Актыўнае даўгалецце — 2030». І мы гатовыя распавесці ўсё ў дэталях.

Ішла гутарка і пра стварэнне працоўных месцаў для людзей з абмежаванымі магчымасцямі. У Віцебскай вобласці 11,4 тысячы чалавек працаўладкавалі такім чынам.

У прыватнасці, тыя, у каго вялікія праблемы са зрокам, без праблем могуць знайсці сабе працу. Сярод іх нямала масажыстаў, кіраўнікоў гурткоў, дарэчы, не толькі пры тэрытарыяльных цэнтрах сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва. Актыўна такія інваліды бяруць удзел у спартыўным жыцці: ад шахматных спаборніцтваў да лыжных гонак.

Варты пераймання вопыт арганізацыі пражывання ў беларускіх дамах-інтэрнатах для састарэлых. Цікава, што, дзякуючы добрым умовам, мерапрыемствам на карысць здароўя, сярэдняя працягласць жыцця там 81 год — вышэй за сярэдні па краіне аналагічны паказчык.

Пры гэтым стаўка робіцца на тое, каб максімальна вялікая колькасць пенсіянераў дажывала свой век у родных сценах. Многае будзе зроблена ў гэтым кірунку расіянамі, і ўжо шмат чаму ёсць павучыцца ў беларусаў.

Мерапрыемства доўжылася каля дзвюх гадзін. Кіраўнікі ведамстваў дамовіліся працягваць супрацоўніцтва ў розных фарматах.

Вельмі шмат ідэй і ў лідараў ветэранскіх, маладзёжных арганізацый, а таксама грамадскіх структур, якія аб'ядноўваюць бацькоў дзяцей з інваліднасцю.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Канцэртная зала

Слухачам у падарунак — прэм'еру!

Канал «Культура» Беларускага радыё сумесна з творчым аб'яднаннем музычных калектываў Белтэлерадыёкампаніі падрыхтаваў сюрпрыз сваім прыхільнікам да Міжнароднага дня музыкі. У праграме «Канцэртная зала» 1 кастрычніка адбудзецца прэм'ера сюіты беларускага кампазітара Аляксандра Літвіноўскага «Пелеас і Мелізанда».

Над гэтым творам кампазітар працаваў на працягу лета 2021 года. Партытура стала ўвасабленнем творчай задумы, народжанай аднайменнай п'есай класіка бельгійскай літаратуры Марыса Метэрлінка. У свой час Аляксандр Літвіноўскі стварыў музыку да тэатральнага спектакля «Пелеас і Мелізанда». Аднак паглыбленне ў сімволіку п'есы прывяло да неабходнасці грунтоўна перапрацаваць ужо гатовыя нумары, пашырыць драматургічны кантэкст і напісаць, па сутнасці, новы, самастойны аркестравы твор.

— У гісторыі пра Пелеаса і Мелізанду багата містычнага, зашыфраванага, недагаворанага. Прыдуманае каралеўства Алемонд існуе быццам па-за межамі пэўнай рэальнай эпохі і па-за часам. Ва ўласным часавым вымярэнні жывуць дзівакаватыя персанажы п'есы. Рухавіком падзей робяцца не ўчынкі герояў, а іх рэфлексіі, спантанныя ўражанні, развагі, абмен эмоцыямі, высвятленне стасункаў, — распавядае Аляксандр Літвіноўскі.

Знаўцы творчасці кампазітара пазнаюць яго аўтарскі стыль, які ў гэтай партытуры аздабляюць прыёмы, уласцівыя музыцы барока, рамантызму, постмадэрнізму. Твор для радыёэфіру запісаў сімфанічны аркестр Белтэлерадыёкампаніі пад кіраўніцтвам дырыжора Аляксандра Высоцкага. Пачатак трансляцыі — у 19:00.

Нагадаем, што канал «Культура» гучыць поўныя суткі. Каардынаты і анлайн-вяшчанне даступныя на сайце www.radiokultura.by.

Алена ДРАПКО.

ШАШКІ («Звязда»)

Выпуск № 149

З 10 да 19 верасня 2021 г. у Курэмаа, вобласці Йыгева (Эстонія), адбыўся асабіста-камандны чэмпіянат Еўропы па шашках-64 сярод мужчын і жанчын. Выдатна выступілі беларускія шашысты. Яна Якубовіч да тытула чэмпіёнкі свету дадала тытул чэмпіёнкі Еўропы. Вера Хвашчынская выйграла сярэбраны медаль. Эма Саўрас заваявала «бронзу». У мужчын перамог гросмайстар Ігар Міхальчанка, які пацвердзіў свой высокі клас.

№ 109

№ 109

Белыя простыя шашкі: e1, g1, a3, e3, g3, f4, h6 (7).

Чорныя простыя шашкі: c5, b6, d6, f6, a7, g7, f8 (7).

Кампазіцыю на дыяграме № 109 склаў украінскі майстар Міхаіл Левандоўскі. Яна атрымалася нібы з практычнай гульні. Белыя дакладнай гульнёй дамагаюцца выйгрышу.

Паспрабуйце адшукаць шлях да перамогі самастойна.

Наступныя кампазіцыі ў шашкі–64 складзеныя вядучым аддзела.

№ 110

Белыя простыя шашкі: e1, d2, f2, e3, g3, b4, f4, h4 (8).

Чорныя простыя шашкі: c3, a5, g5, b6, d6, f6, h6, c7, e7 (9).

№ 111

Белыя простыя шашкі: e1, d2, f2, h2, e3, b4, h4 (7).

Чорныя простыя шашкі: c3, f4, a5, g5, b6, f6, c7, e7, f8 (9).

№ 112

Белыя простыя шашкі: g1, e3, b4, d4, f4, e5 (6).

Чорныя простыя шашкі: a3, h4, f6, c7, g7, d8 (6).

Наступныя дзве кампазіцыі ў шашкі–100 прапануе гросмайстар па шашачнай кампазіцыі Валдас Бяляўскас (Літва).

№ 113

Белыя простыя шашкі: 41, 42, 33, 28, 12, 7, 10 (7).

Чорныя простыя шашкі: 43, 36, 34, 35, 16, 9 (6).

№ 114

Белыя простыя шашкі: 48, 42, 43, 28, 23, 16, 18, 19, 14, 9, 10 (11).

Чорныя простыя шашкі: 44, 37, 31, 32, 34, 27, 17, 11, 7, 3, 5 (11).

Ва ўсіх пазіцыях белыя пачынаюць і выйграюць. Прозвішчы чытачоў, якія дашлюць правільныя адказы, будуць апублікаваныя.

Выпуск № 148 ад 17.09.21.

№ 104 1. b4-a5 e3:a3 2. a5:c7 d8:b6 3.a1-b2 a3:g5 4.h4:a5 h6-g5 5. a5-d2 g5-h4 6.d2-e1 a7-b6 7. e1-f2 b6-a5 8. f2-e1 +

№ 105 1. a5-b6 f6:d4 2. b6-c7 b8:d6 3. g1-f2 e3:g1 4. c1:e7 f8:d6 5. h6:c5 g1:b6 6. a7:c5 +.

№ 106 1. c7-b8 a5:e5 [1...h6:f4 2.d6-c7 f8:d6 3. c7:e1 a5:c7 4. b8:a3].

2. b8:a3 f8:d6 3. a3:f8 h6:f4 4. f8:g1 +.

№ 107 1. 43-38 32:43 2. 49:38 40:49 3. 35-30 49:47 4. 30-25 47:20 5. 25:01 +.

№ 108 1. 39-34 29:47 2. 34-30 47:20 3. 30-25 12:23 4. 25:01 +.

Першымі дакладныя адказы даслалі С. Бурко (Орша), У. Бандарык (Мінскі р-н), В.Таўкачоў (в. Уздзевічы, Клімавіцкі р-н, Магілёўская вобл.), У. В. Дударэвіч (в. Новая Мыш, Баранавіцкі р-н, Брэсцкая вобл.), А. Галаванаў, П. і В. Шульгі (усе Мінск), Ф. Карпей, Л. Жыхар (абодва Мядзел), У. Панько (Камянец), І. Ананіч (Гродна), В. Ваўчкоў (Маладзечна), С. Рашэцін (Ашмяны).

Пішыце на адрас: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, газета «Звязда», e-mail: info@zviazda.by або vorush@yandex.ru.

Віталь ВАРУШЫЛА, майстар спорту.

Сядзі і глядзі

ВЯСЁЛЫЯ ПРЫГОДЫ ДЛЯ ВОСЕНІ

Адразу два фільмы, якія даўно ўжо сталі класікай савецкага кінематографа, пакажуць у суботу на «Беларусь 3». У дзённым эфіры пабачым камедыі «Паласаты рэйс» і «12 крэслаў».

Першая кінастужка, рэжысёрам якой стаў Уладзімір Фецін, убачыла свет у 1961 годзе. І адразу стала абсалютным лідарам пракату. Аднак ніхто, мабыць, і не здагадваўся, што адбылося гэта дзякуючы шэрагу выпадковасцяў — месцамі смешных, а часам трагічных. Дарэчы, перад паказам фільма на сацыякультурным канале ўвазе гледачоў прадставяць выпуск праграмы «Вялікае кіно», дзе зможам даведацца шмат цікавых падрабязнасцяў пра вядомы кінатвор. Нам распавядуць, чаму акцёры ўцякалі са здымачнай пляцоўкі, якія піруэты вялікай палітыкі паставілі кропку ў лёсе карціны, а таксама чаго каштавала работа ў ёй пастаноўшчыку трукаў з драпежнікамі Канстанціну Канстанціноўскаму...

Калі згадаем сюжэт, то гэты фільм — гісторыя пра тое, як на цеплаходзе вязуць незвычайны, але каштоўны груз — тыграў і львоў, а яшчэ ў падарунак пакупніку — малпачку. А суправаджае жывёл саманазваны дрэсіроўшчык Шулейкін (ён працуе кухарам на гандлёвым прадпрыемстве). Аднак усе прыгоды пачынаюцца ў адкрытым моры, калі малпачка выпускае драпежнікаў на волю...

Што да другога фільма, якому сёлета спаўняецца паўстагоддзя, то яго знялі па аднайменным рамане Ілы Ільфа і Яўгена Пятрова «12 крэслаў». Рэжысёрам карціны стаў Леанід Гайдай. Тады яе прызналі найлепшай работай творцы разам з «Брыльянтавай рукой», «Аперацыяй «Ы».

Варта адзначыць, што на ролю Астапа Бэндэра спрабавалі прайсці больш за 20 кандыдатаў, але ў выніку зацвердзілі Арчыла Гаміяшвілі. Неяк акцёр нават распавядаў: «Амаль трыццаць гадоў — цэлае жыццё, і я яго пражыў Астапам і разам з ім. Дзякуючы гэтай ролі я стаў знакамітым чалавекам... Я знаходжу паміж намі шмат агульнага. Я артыст, і мне патрэбен глядач. Астап таксама артыст, і яму таксама патрэбна аўдыторыя. Няма аўдыторыі — і мяне нічога не цікавіць: ні крэслы, ні грошы». З ліку акцёраў у фільме яшчэ задзейнічаны Сяргей Філіпаў, Наталля Крачкоўская, Юрый Нікулін і іншыя. Сюжэт кінастужкі, думаю, вядомы калі не ўсім, то многім... Падчас рэвалюцыі і кароткага перыяду ваеннага камунізму многія хавалі свае каштоўнасці. І вось Іпаліт Мацвеевіч Вараб'янінаў, былы свецкі леў, а цяпер сціплы справавытворца ЗАГСа, даведваецца ад цешчы, што некалі яна схавала сваё шматлікае багацце ў адным з дванаццаці крэслаў гасціннага гарнітура вядомага майстра Гамбса. Таму, кінуўшы ўсё, герой накіроўваецца на пошук тых самых крэслаў. А вось дапамагчы яму падраджаецца (вядома, не за проста так) малады авантурыст, «вялікі камбінатар» Астап Бэндэр... І ўсё, можа, было б і па-іншаму, калі б пра таямніцу жанчына перад смерцю не паведаміла яшчэ і бацюшку Фёдару, які ўсё жыццё марыць пра ўласны свячны заводзік у Самары... Каб паназіраць за прыгодамі ўсіх герояў карціны, варта ўсяго толькі запланаваць сабе кінасеанс на выхадныя і ўключыць тэлеканал «Беларусь 3».

Алена ДРАПКО.

Беларусь 1

6.00, 7.20, 8.15 Добрай раніцы, Беларусь!
7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00 Навіны.
7.05, 8.05 Навіны эканомікі.
7.10, 8.10, 18.15, 1.05 Зона Х (16+).
8.50 Слова Епіскапа Казіміра Велікасельца на дзень Святога Францыска Асізскага.
9.10 Галоўны эфір.
10.40, 12.10, 18.35, 19.20 Драма «Нішто не здараецца двойчы» (16+).
13.05, 15.25 Драма «Вучылка» (16+).
15.10, 18.00 Навіны рэгіёна.
17.05 Беларуская часінка.
21.00 Панарама.
21.45 Зразумелая палітыка.
22.00 Серыял «След» (16+).
0.50 Арэна.
1.25 Дзень спорту.

Беларусь 2

6.00 «Уключайся!» (12+)
9.00, 19.30 Тэлебарометр.
9.05 «Зразумець. Дараваць» (16+).
10.30 Камень, нажніцы, папера (16+).
11.10 «На тыдзень» (16+).
12.05 Трылер «Які бяжыць у лабірынце: выпрабаванне агнём» (12+).
14.40 «У пошуках Нэма» (0+).
16.30 «Стыч!» (6+)
17.00 «Суперлато».
17.40 «Арол і рэшка. Дзяўчаты» (16+).
18.35 «Сакрэтны мільянер» (16+).
20.00 «Зразумець. Дараваць» (16+).
21.10 Спортлато 6 з 49, КЕНА.
21.20 «Тата папаў» (16+).
23.15 Хачу ў тэлевізар!

Беларусь 3

7.00 «Дабраранак».
7.35 «Беларуская кухня». Лешч, запечаны з крупамі.
8.05, 12.00, 19.40, 23.25 Навіны культуры.
8.25 «Нацыянальны хіт-парад».
9.20, 18.10 «Версія палкоўніка Зорына». Маст. фільм (12+) [СЦ].
10.50 «Кадры жыцця». Сцэнарыст, рэжысёр, прадзюсар Юрый Іграша.
11.45 «Архітэктура Беларусі» [СЦ].
12.20 «Беларуская кухня». Мазэха, каўбаса пальцам піханая.
12.50 «Наперад у мінулае».
13.15, 21.05 «Апошні дзень». Ніна Сазонава (12+) [СЦ].
14.00, 21.40 «Жыве такі хлопец». Маст. фільм (12+) [СЦ].
15.40 «Навукаманія» (6+).
16.05 Канцэрт ВІА «Поющие гитары». «Нет тебя прекрасней».
17.25 «Справа жыцця». Анатоль Алай.
17.45 «Пётр Конюх». Дак. фільм (12+).
20.00 «Сваімі словамі».
20.40 «Калыханка» (0+).

Беларусь 5

7.00 Тэніс. ВТА.
9.00 Міні-футбол. Чэмпіянат свету.
11.05 Хакей. КХЛ.
13.05 Піт-стоп.
13.35 Футбол. Чэмпіянат Беларусі.
14.20 Аўтаспорт. Экстрым-Е.
14.50 Футбол. Чэмпіянат Англіі.
16.50 Міні-футбол. Чэмпіянат Беларусі.
18.50 Спорт-цэнтр.
19.00 Барацьба. Чэмпіянат свету.
21.50 На грані фолу.
23.15 Футбол. Чэмпіянат Англіі.

АНТ

6.00, 7.10, 8.10 «Наша раніца».
7.00, 8.00, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00 [СЦ], **20.30, 1.20** Нашы навіны.
9.10 Контуры.
10.10 «Жыць здорава!» (16+)
11.15 «Модны прыгавор» (6+).
12.20 «Бесталковыя нататкі» (12+).
13.15, 23.40 Серыял «Курт Сеіт і Аляксандра» (16+).
15.00 «Давай пажэнімся!» (16+)
16.20 «Мужчынскае / Жаночае» (16+).
17.20, 18.20 «На самай справе» (16+).
18.50 «Удача ў прыдачу!» (12+).
18.55 «Няхай гавораць» (16+)
20.00 Час.
21.15 «Прапаганда» (16+).
21.35 Серыял «Рускія горкі» (16+).

СТБ

6.00, 6.40, 7.45 «Раніца СТБ».
6.30 [СЦ], **7.30** [СЦ], **8.30** [СЦ], **10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** Навіны.
8.40 «Тыдзень».
10.40, 0.10 «Загадкі чалавецтва з Алегам Шышкіным» (16+).
11.35 «Як уладкаваны свет» (16+).
12.35, 20.45 «Самыя шакавальныя гіпотэзы» (16+).
13.45, 23.20 «Таямніцы Чапман» (16+).
14.40 «Неверагодна цікавыя гісторыі» (16+).
15.35, 16.50 «Вялікія таямніцы» (16+).
18.30 «Па сутнасці».
20.15, 23.15 «СТБ спорт».
20.20 «Сталічныя падрабязнасці».
20.30 «Міншчына».
22.00 «Скардзіцца дазваляецца».
0.55 «Самая карысная праграма» (16+).
1.50 «Мінтранс» (16+).

МІР

5.00 Мультфільмы.
5.15, 10.10 Серыял «Вышэйшы пілатаж» (16+).
10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Навіны. Бягучы радок.
13.15, 14.10, 15.05, 16.20, 3.40 «Справы судовыя. Грошы вярніце!» (16+)
17.00 «Міравое пагадненне» (16+).
18.00, 4.25 «Справы судовыя. Бітва за будучыню» (16+).
19.25, 20.15 «Гульня ў кіно» (16+).
21.00, 22.00 Шоу «Назад у будучыню» (16+).
22.55 «Дарогой дальнею...» (16+)
23.50 Серыял «Даішнікі» (16+).

РТР—Беларусь

6.05 «Новая раніца».
11.00, 14.00, 17.00, 20.00 Весткі.
11.30 «Таямніцы Беларусі» (16+).
12.45 «У людзях».
13.35 «Плюс мінус».
13.50, 16.50, 19.50, 23.00 Навіны — Беларусь.
14.30 Фільм «Вось гэта каханне!» (16+)
17.15 «60 хвілін».
18.30 «Андрэй Малахаў. Прамы эфір» (16+).
21.05 Серыял «Шуша» (16+).
23.10 «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым» (12+).

НТБ—Беларусь

6.00 «Астрапрагноз».
6.10 «Здароўе» (12+).
7.05 «Маршрут пабудаваны» (12+).
7.40, 8.25, 10.25 Драма «Ваўчынае сонца» (16+).
8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Сёння.
13.25 Надзвычайнае здарэнне.
13.55 Серыял «Чужы раён» (16+).
16.20, 19.40, 21.45, 23.20 Сёння. Галоўнае.
16.30 «За гранню» (16+).
17.25 «ДНК» (16+).
18.30, 19.55 Дэтэктыў «Метад Міхайлава» (16+).
21.50 «НЗ.by».
22.10, 23.35 Дэтэктыў «Балабол-3» (16+).

8 канал

7.00, 14.45, 17.25, 21.05, 0.10 «Надвор'е» + «Эрана».
7.05, 14.50 Мультпарад (6+).
7.30, 20.45 «Прыколы 13-й школы» (6+).
7.35 М/ф. «Цёмны крышталь» (12+).
8.25 Серыял «Лок і ключы» (16+).
9.15, 15.05 Серыял «Служба выратавання 911» (16+).
10.00 Серыял «Інданезія» (12+).
11.00 Драма «Дваццаць адно» (16+).

13.05 Серыял «Яна напісала забойства» (12+).
15.00, 18.10 «Хачу ў Парыж» (12+).
15.50 Серыял «Чорна-белае каханне» (16+).
17.30 Серыял «Тэорыя Вялікага выбуху» (16+).
18.15 Серыял «Непрыдуманая гісторыя» (12+).
19.50 Серыял «МакМафія» (18+).
20.50 «Вечарніца» (0+).
21.10 Дэтэктыў «Выпрабаванне невінаватасцю» (12+).

ВТВ

6.00, 8.00, 8.55, 10.15, 11.20, 12.50, 13.55, 15.45, 18.20, 20.55, 22.30, 23.50 Прагноз надвор'я.
6.05 «Раніца з гумарам» (16+).
8.05 «Зала чакання» (16+).
9.00 «Лекс і Плу» (6+).
9.25 «Тры каты» (0+).
9.50 «Царэўна» (6+).
10.20 «Рускія не смяюцца» (16+).
11.25, 1.45 «Проста кухня» (16+).
12.00 «Галерэя прыгажосці» (16+).
12.55 «КВЗ. Па-нашаму» (16+).
14.00 «Рыа» (0+).
15.50, 18.25 Серыял «Кухня» (16+).
21.00 «Уральскія пельмені» (16+).
22.35 «Велабайкі» (16+).
23.10 «Наш рамонт» (16+).
23.55 «Кіно ў дэталях» (16+).
0.50 «Рогаў у справе» (16+).
2.15 Серыял «Татавы дочкі» (12+).
3.25 «Даеш моладзь» (16+).
5.05 «6 кадраў» (16+).

Культура

6.30 «Вялікія міфы. Адысея».
7.05 «Казкі-невялічкі», «Чыпаліна».
8.00 «Вялікія і маленькія».
10.00 «Мы — грамацеі!»
10.40 «Дзямідавы» [СЦ].
13.10 Неўскі каўчэг [СЦ].
13.40, 2.05 Дыялогі пра жывёл [СЦ].
14.20 «Абсалютны слых».
15.05 «Гульня ў бісер».
15.45 «Колер белага снегу».
16.30 «Карціна свету з Міхаілам Кавальчуком».
17.10 «Першыя ў свеце».
17.25 «Пешшу. Іншая справа» [СЦ].
17.50 «Паўночнае ззянне Ірыны Мятліцкай» [СЦ].
18.35 «Рамантыка рамана».
19.30 Навіны культуры.
20.10 «Той самы Мюнхгаўзен» [СЦ].
22.25 «Травіята».
0.40 «Ніколі» [СЦ].
2.45 «Гром не грымне».

Настальгія

6.00 «Да і пасля...» (16+)
7.00, 8.45, 9.40, 11.45, 18.55, 20.40, 21.40, 00.55, 2.40, 3.40, 5.00 Музычная настальгія (12+).
7.20 Маст. фільм «Ваенна-палявы раман» (16+).
9.00, 21.00, 3.00 «Мінулы час» (12+).
10.00 «Колба часу» (16+).
11.00, 17.20, 23.20 «Блефклуб» (18+).
12.00 Маст. фільм «Сэрцы чатырох» (12+).
13.30 «Аншлаг! Аншлаг!» (12+)
15.00 «Быў час» (16+).
16.00 Маст. фільм «Калі можаш, прабач...» (16+)
18.00, 4.00 «Народжаныя ў СССР» (16+).
19.10 Фільм-канцэрт «З дазволу праграмы «Бенефіс» (12+).
20.05 Дак. фільм «Фільм пра фільм. Сцеражыся аўтамабіля» (12+).
22.00 Маст. фільм «Год цяляці» (18+).
0.00 «Яловая субмарына» (18+).
1.15 Маст. фільм «Адзінокая жанчына жадае пазнаёміцца» (16+).

EuroSport 1

0.00, 12.30 Веласпорт (трэк). ЧЕ. Грэнхен (12+).
1.00, 9.30 Мотагонкі. Endurance (12+).
2.30 Лёгкая атлетыка. Лонданскі марафон (6+).
4.00, 8.00 Снукер. Welsh Open (6+).
6.00, 14.00 Веласпорт. «Тур Ламбардыі» (12+).
11.30 Алімпійскія гульні. Тэлечасопіс «Алімпійскі суддзя» (12+).
15.30, 21.30 Веласпорт. «Тур дэ Вандэя». Мужчыны (12+).
16.20, 20.00 Веласпорт. «Парыж — Тур». Мужчыны.
18.00 Веласпорт. «Тур Ламбардыі». Мужчыны (12+).
18.30, 23.20 Лёгкая атлетыка. Чыкагскі марафон (6+).
20.25 Велакрос. Кубак свету. Ватэрлоа. Жанчыны.
21.55 Велакрос. Кубак свету. Ватэрлоа. Мужчыны.

Кінакамедыя

2.00 «З вачэй — далоў, з чарта — прэч!» (16+)
3.50 «Чаго хочуць жанчыны?» (16+)

6.05 «Алёша Паповіч і Тугарын Змей» (12+).
7.35 «Дабрыня Мікіціч і Змей Гарыныч» (6+).
8.50 «Ілья Мурамец і Салавей Разбойнік» (12+).
10.20 «Тры волаты і Шамаханская царыца» (12+).
11.50 «Тры волаты на далёкіх берагах» (6+).
13.10 «Тры волаты і марскі цар» (6+).
14.35 «Тры волаты і прынцэса Егіпта» (6+).
15.55 «Тры волаты і спадчынніца пасада» (6+).
17.25 «Халоп» (12+).
19.30 «Маска» (12+).
21.20 «Прасцячка» (16+).
23.10 «Тая яшчэ парачка».

ТБ3

6.00, 8.15 Калекцыя «Беларусьфільма» (12+).
7.40 «Улегцы» (12+).
10.05, 23.45 «Глядзі сам» (16+).
10.20 «Выратуйце, я не ўмею гатаваць!» (12+)
11.15 «Ваўчынае сонца» (16+).
15.50 «Добры дзень з Валерыяй» (12+).
16.50 «Як прыручыць дракона» (6+).
18.35, 5.10 «Дзённік экстрасэнса» (16+).
19.40 «Шэрлакі» (16+).
21.05 «Армагедон» (12+).
0.00 «Споведзь экстрасэнса» (12+).
0.55 «Звышнатуральнае». Серыял (16+).
3.55 «Гэта рэальная гісторыя» (16+).
4.45 «Асцярожна: ашуканцы!» (16+)

ТБ1000

5.00 Мірны воін (12+).
7.15 Малая на мільён (16+).
9.50 Бацька нявесты (6+).
11.45 Бацька нявесты-2 (6+).
13.50 Оптам танней (12+).
15.35 Оптам танней-2 (12+).
17.15 Сіняя бездань (16+).
19.00 Сіняя бездань-2 (16+).
20.35 Сквіцы (16+).
22.55 Сквіцы-2 (16+).
1.00 Прывідны патруль (12+).
2.35 Асобная думка (16+).

ТБ1000 Рускае кіно

5.30 Цені забытых продкаў (16+).
7.20, 4.40 Красуня ва ўдары (12+).
9.10 Лаві момант (16+).
10.35 Марафон жаданняў (16+).
12.15 Спадарожнік (16+).
14.15 Населены востраў (12+).
16.25 Населены востраў: сутычка (12+).
18.20 Абаронцы (12+).
20.00 Маёр Гром: чумны доктар (12+).
22.25 Правадыр (16+).
0.00 Былая (18+).
1.35 Каханне з абмежаваннямі (16+).
3.10 Мой хлопец — анёл (16+).

National Geographic

6.00, 7,15 Навуковыя глупствы (16+).
6.25, 6.50 Гульні розуму (16+).
8.10, 9.55 Мегазлом (16+).
9.05, 9.30 Зрабіць за адзін дзень (16+).
10.55, 11.45 Сапраўдны суперкар (16+).
12.35, 13.25 Непакорлівы востраў (16+).
14.15, 15.10, 16.05, 17.05 Дзяржава (16+).
18.00, 19.20 911: Адзін дзень з жыцця Амерыкі (16+).
20.10, 21.00, 21.50 Дзікі тунец (16+).
22.40, 2.00, 2.45 Асушыць акіян (16+).
23.30, 00.20 Аўта-SOS (16+).
1.10, 3.35 Невядомая планета Зямля (16+).
4.25, 5.15 Востраў бунтароў (16+).

Discovery

8.00, 20.20, 7.35 Як гэта зроблена? (12+)
8.25, 8.50, 9.20, 9.45, 10.15, 10.40, 19.50 Як гэта ўладкавана? (12+)
11.10, 12.05, 13.55 Як уладкаваны Сусвет (12+).
13.00 Касмічныя забойцы (16+).
14.50, 16.10 Кафэ, закусачныя і забягалаўкі (12+).
16.40 Голыя і напалоханыя XL (16+).
18.30 Аўтабан А8 (12+).
19.25 Прыгожае жыццё (12+).
21.15 Смяротны ўлоў (16+).
22.10 Аляска: апошні рубеж (16+).
23.05 Сталёвыя хлопцы (12+).
0.00, 00.25 Білі скупляе Бруклін (12+).
0.55 Металаломшчыкі (16+).
1.50 Склады: бітва ў Канадзе (16+).
4.27, 5.14, 6.01 Махінатары (12+).
6.48 Невядомая экспедыцыя (16+).

У праграме магчымы змяненні. Перадрукоўка праграмы забаронена. [СЦ] – фільм транслюецца са скрытымі субцітрамі.

Беларусь 1

6.10 Драма «Гаспадар дома» (16+).
7.55 Клуб рэдактараў (16+).
9.00, 12.00, 15.00, 19.00 Навіны.
9.10 «Арсенал» (12+).
9.40 Гісторыі выратавання (12+).
10.15 «Зона Х». Вынікі тыдня (16+).
10.50 Маршрут пабудаваны (12+).
11.30 «Пытанне нумар адзін».
12.10 Навіны. Цэнтральны рэгіён.
12.35, 22.30 Драма «Немагчымая жанчына» (12+).
14.30 Адзін дзень (12+).
15.15 Вакол планеты.
15.55 «Нагода ёсць» (12+).
16.30 «Партызанскі рубеж» (12+).
16.40, 19.10 Драма «Крытычны ўзрост» (12+).
20.35 Навіны надвор'я.
21.00 Галоўны эфір.

Беларусь 2

6.00 «Уключайся. Найлепшае за тыдзень» (12+).
8.00, 19.35 Тэлебарометр.
8.05 «Клон». Серыял (16+).
10.05 «Тры першыя спатканні» (16+).
11.00 «Паненка-сялянка» (16+).
12.00 «Доктар Дулітл» (12+).
13.35 «На нажах» (16+).
14.40 «Тата папаў» (16+).
16.45 «Вежа» (12+).
9.50, 10.25 Серыял «Званар» (16+).
11.10 Серыял «Ляснік» (16+).
13.25 Надзвычайнае здарэнне.
13.55 Серыял «Чужы раён» (16+).
16.30 «ДНК» (16+).
17.35, 19.55, 22.20 Дэтэктыў «Метад Міхайлава» (16+).
21.50 «НЗ.by: час вынікаў».
23.40 «Шоумаскгаон» (12+).

8 канал

7.00, 14.05, 19.45, 21.05, 00.40 «Надвор'е» + «Эрана».
7.05 М/ф «Трансформеры прайм» (6+).
7.30, 14.10 «Прыколы 13-й школы».
7.35 Серыял «Цёмны крышталь» (12+).
8.20 Серыял «Лок і ключы» (16+).
9.05, 14.45 Серыял «Служба выратавання 911» (16+).
9.50 «Непал» (12+).
10.40 Прыгоды «Раман з каменем» (16+).
12.30 Серыял «Яна напісала забойства» (12+).
14.15 М/ф. «Дом Савы» (0+).
14.35, 18.10 «Хачу ў Парыж» (12+).
14.40 «Гатуй як шэф» (12+).
15.30 Серыял «Чорна-белае каханне» (16+).
17.10 Серыял «Тэорыя Вялікага выбуху» (16+).
18.15 Серыял «Непрыдуманая гісторыя» (12+).
19.50 Серыял «МакМафія» (18+).
20.50 «Вечарніца» (0+).
21.10 Трылер «Вобласці цемры» (16+).
23.00 Серыял «Клікбейт» (18+).

ВТБ

6.00, 8.55, 9.55, 11.05, 12.50, 13.55, 15.55, 16.55, 19.55, 22.55, 23.55 Прагноз надвор'я.
6.05, 14.00 «Раніца з гумарам» (16+).
9.00, 23.00 «КВЗ. Па-нашаму» (16+).
10.00 «Наш рамонт» (16+).
10.35 «Дурні і дарогі» (16+).
11.10 «Эластыка» (12+).
12.55 «Уральскія пельмені» (16+).
16.00 Серыял «Вароніны» (12+).
17.00 Серыял «Гранд» (16+).
20.00 Серыял «Гатовыя на ўсё» (16+).
21.00 «Дружба і ніякага сексу?» (12+).
0.00 Серыял «Псіхалагіні» (16+).
1.00 Серыял «Анжаліка» (16+).
2.00 Серыял «Маладзёжка» (16+).
3.35 «Адна за ўсіх» (16+).
4.45 «6 кадраў» (16+).

Культура

6.30, 7.00, 7.30, 8.30, 10.00, 15.00, 19.30, 0.00 Навіны культуры.
6.35 «Пешшу...»
7.05, 20.05 «Правілы жыцця».
7.35, 0.20 «Старажытныя нябёсы» [СЦ].
8.35, 18.20, 2.40 Колер часу.
8.45 Легенды сусветнага кіно.
9.15, 20.45 «Сімфанічны раман» [СЦ].
10.15 «Назіральнік».
11.10, 1.20 XX стагоддзе.
12.30 «Шахеразада».
13.35 «Аляксей Лепуноў. Асоба дваранскага паходжання».
14.15 Галівуд Краіны Саветаў.
14.30 «Сімон Шноль. Ад 0 да 80» [СЦ].
15.05 Навіны. Падрабязна. Кіно.
15.20 «Біблейскі сюжэт».
15.45 «Белая студыя».
16.30, 22.15 «Аптымісты».
17.25 Юбілей ДАСА.
18.35 Прыступкі цывілізацыі [СЦ].
19.45 «Галоўная роля».
20.30 «Добрай ночы, малыя!»
21.30 Улада факта.
23.15 «Вінаватасць даказаная» [СЦ].

Настальгія

6.00 «СевАлогія» (18+).
6.55, 8.40, 9.40, 11.00, 11.40, 12.50, 14.35, 15.40, 17.00, 17.40, 20.20, 21.40, 23.00, 3.40 Музычная настальгія (12+).
7.15 Маст. фільм «Інспектар крымінальнага вышуку» (16+).
9.00, 15.00, 21.00, 3.00 «Мінулы час» (12+).
10.00, 16.00, 22.00, 00.00 «Народжаныя ў СССР».
11.30, 17.30 «Мастак і паэт Міхаіл Гробман чытае свае вершы» (18+).
12.00 «Быў час» (16+).
13.15 Маст. фільм «Насця» (16+).
18.00 «Спяем, сябры!» (12+)
19.00 Маст. фільм «Самазабойца» (18+).
1.10 Дак. фільм «Руса турыста. Упершыню за мяжой» (16+).
2.30 Фільм-канцэрт «Перад далёкай дарогай» (12+).
3.45 Маст. фільм «Іспанская актрыса для рускага міністра» (18+).
5.20 «Блеф-клуб» (16+).

EuroSport 1

0.05, 22.30 Навіны (6+).
0.10, 11.30 Тэлечасопіс «Дух паруснага спорту» (6+).
0.40, 6.00, 12.30, 18.00, 19.00 Веласпорт (трэк). ЧЕ. Грэнхен (12+).
1.30, 9.30 Конны спорт. Кубак нацый. (6+).
2.30 Тэлечасопіс «Жывыя легенды». Наталі Коглін (12+).
3.00 Тэлечасопіс «Зала славы». Токіа-2020 (12+).
4.00, 8.00 Снукер. Northern Ireland Open (6+).
10.30 Тэлечасопіс ERC All Access (12+).
11.00 Веласпорт. Тэлечасопіс Cycling Show (12+).
12.00, 15.00 Веласпорт. «Бенш — Шыме — Бенш». Мужчыны (12+).
14.00, 22.35 Веласпорт. Сусветны тур. Жанчыны (12+).
16.20 Веласпорт. «Мілан — Турын». Мужчыны.
23.35 Вольная барацьба. Чэмпіянат свету (12+).

Кінакамедыя

1.20 «Паляўнічыя на прывіды» (6+).
3.40 «З рэчамі на вылет!» (16+)
5.15 «Прасцячка» (16+).
7.10 «Іван Царэвіч і Шэры Воўк» (6+).
8.45 «Іван Царэвіч і Шэры Воўк-2» (6+).
10.05 «Іван Царэвіч і Шэры Воўк-3» (6+).
11.35 «Іван Царэвіч і Шэры Воўк-4» (6+).
13.15 «Крымінальная фішка ад Генры» (16+).
15.15 «Ілья Мурамец і Салавей Разбойнік» (12+).
16.45 «Тры волаты і Шамаханская царыца» (12+).
18.10 «Тры волаты на далёкіх берагах» (6+).
19.30 «Дзікая парачка» (16+).
21.20 «Тая яшчэ парачка» (18+).
23.35 «Чаго хочуць жанчыны?» (16+)

ТБ3

6.00 Калекцыя «Беларусьфільма» (12+).
8.10 «Чытальнік» (16+).
9.15, 4.15 «Перыскоп» (16+).
9.40 «Каралёк — птушачка пявучая». Серыял (16+).
11.30 «Урачы» (16+).
12.35, 18.00, 3.20 «Сляпая» (16+).
13.40, 19.10, 2.55 «Варажбітка» (16+).
14.15 «Старац» (16+).
14.55, 4.30 «Суд ідзе» (16+).
16.00 «Пятая варта» (16+).
20.25 «Звышнатуральнае». Серыял (16+).
23.15 «Фантом» (16+).
0.25 «Лінія абароны» (16+).
1.05 «РЭД-2» (12+).

ТБ1000

5.45, 6.25, 17.15, 18.05 Доктар Хаус (16+).
7.45 Маўчы ў анучку (16+).
9.50 Чатыры вяселлі і адно пахаванне (12+).
12.05 Галодныя гульні (16+).
14.35 Галодныя гульні: і ўспыхне полымя (16+).
19.00 Практычная магія (16+).
20.55 Дом каля возера (12+).
22.45 Адвакат д'ябла (16+).
1.20, 3.15 Галодныя гульні: Сойка-перасмешніца (16+).

ТБ1000 Рускае кіно

6.30 Лаві момант (16+).
7.45 З 8 Сакавіка, мужчыны! (12+)
9.35 Ласкавы май (16+).
11.50 ПіраМММіда (16+).
13.50 Я худзею (16+).
15.40, 16.15, 16.50, 17.25, 18.00, 18.30 Насця, набярыцеся смеласці! (16+).
19.05 Гуляй, Вася! Спатканне на Балі (16+).
21.05 Марафон жаданняў (16+).
22.45 Красуня ва ўдары (12+).
0.35 Жанчыны супраць мужчын (18 +).
1.55 Арытмія (18+).
3.45 Ярды (16+).

National Geographic

6.00 Як перамагаць ва ўсім (16+).
6.25 Машыны: разабраць і прадаць (16+).
7.10 Аўта-SOS (16+).
8.05, 12.20 Ледзяная дарога (16+).
8.55 Суперкар са сметніка (16+).
9.45 Рыбы-пачвары (16+).
10.40 Дзікі тунец (16+).
11.30 Дзікі тунец: Поўнач супраць Поўдня (16+).
13.10 Таямніцы светабудовы (16+).
14.05, 14.55 Космас: магчымыя сусветы (16+).
15.50 Сапраўдны геній са Стывенам Хокінгам (16+).
16.40, 17.35 Марс (16+).
18.30 Касмічны шатл: трыумф і трагедыя (16+).
19.15, 20.10 Расследаванні авіякатастроф (16+).
21.00, 3.20 Дзікі тунец (16+).
21.50 Дзікі тунец: Поўнач супраць Поўдня (16+).
22.35 Эвакуацыя Зямлі (16+).
23.25 Гісторыі выратавання (16+).
0.20 Аляска: новае пакаленне (16+).
1.05 Востраў бунтароў (16+).
1.50 Ліхтугі за мяжой (16+).
2.35 Ліхтугі за мяжой: злачынства і пакаранне (16+).
4.05 Крывавыя таямніцы Еўропы (16+).
4.50 Навуковыя глупствы (16+).

Discovery

8.00, 10.15, 10.40, 21.15, 21.40, 1.50, 2.15, 2.45, 3.10, 3.40, 4.04, 7.35 Як гэта ўладкавана? (12+)
8.25, 11.10, 16.40, 22.10 Махінатары (12+).
9.20, 9.45, 20.20, 20.45 Склады: бітва ў Канадзе (16+).
12.05 Касмічныя забойцы (16+).
13.00, 17.35 Як уладкаваны Сусвет (12+).
13.55, 14.20, 14.50, 15.15, 15.45, 16.10 Як пабудаваць... што заўгодна (12+).
18.30, 18.55 Кафэ, закусачныя і забягалаўкі (12+).
19.25, 4.27 Хуткія і гучныя (12+).
23.05, 5.14 Голыя і напалоханыя XL (16+).
0.55, 6.48 Скаваныя (16+).

У праграме магчымы змяненні. Перадрукоўка праграмы забаронена. [СЦ] – фільм транслюецца са скрытымі субцітрамі.

чацвер, 7 кастрычніка ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

Беларусь 1

6.00, 7.20, 8.15 Добрай раніцы, Беларусь!
7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00 Навіны.
7.05, 8.05 Навіны эканомікі.
7.10, 8.10, 18.15, 00.35 Зона Х (16+).
8.50 Слова Епіскапа Казіміра Велікасельца на свята Прасвятой Дзевы Марыі Разарыя.
9.10, 22.15 Серыял «След» (16+).
10.50 «Скажынемаўчы».
11.45, 12.10, 13.05, 18.35, 19.20 Драма «Нішто не здараецца двойчы» (16+).
14.00 «Здорава здаровым быць!» (6+) [СЦ]
14.45, 15.25 Драма «Усё магло быць інакш» (16+).
15.10, 18.00 Навіны рэгіёна.
17.05 Беларуская часінка.
21.00 Панарама.
21.45 Адзін дзень (16+).
0.15 Сфера інтарэсаў.
0.55 Дзень спорту.

Беларусь 2

6.00 «Уключайся!» (12+)
9.00, 16.55 Тэлебарометр.
9.05 Серыял «Сляпая» (16+).
10.15 «Экстрасэнсы-дэтэктывы» (16+).
11.20, 18.15 Баявік «Анёлы» (16+).
13.15 «На тыдзень» (16+).
14.05 «Камень, нажніцы, папера» (16+).
14.45 «Арол і рэшка. Дзяўчаты» (16+).
15.55 Нічога сабе ньюз (12+).
16.00 «ПІН_КОД» (12+).
17.00 «Клон». Серыял (16+).
17.50 «Каралі палат» (16+).
20.05 Серыял «Сляпая» (16+).
21.10 Спортлато 6 з 49, КЕНА.
21.25 «Развод і дзявочае прозвішча» (16+).
22.40 «Экстрасэнсы-дэтэктывы» (16+).

Беларусь 3

7.00 «Дабраранак».
7.35 «Беларуская кухня». Кішка.
8.05, 12.00, 19.40, 23.05 Навіны культуры.
8.25, 16.30 «Цыган». Серыял (12+) [СЦ].
11.25 «Кіно маёй краіны».
12.20 «Беларуская кухня». Смажанка з пеўнем, герос.
12.50 «Наперад у мінулае».
13.25, 21.05 «Начныя ластаўкі» (12+) [СЦ].
15.10, 22.50 «Крылы Перамогі».
15.25 «Пераможцам — слава!» Канцэрт Беларускага дзяржаўнага ансамбля «Песняры».
20.00 «Сваімі словамі».
20.40 «Калыханка» (0+).

Беларусь 5

6.00 Тэніс. ВТА.
8.05 Барацьба. Чэмпіянат свету.
11.15 Гандбол. Кваліфікацыя ЧЕ-2022. Жанчыны.
12.55, 21.35 Футбол. Ліга нацый.
15.00 Між іншым.
15.20 Валейбол. Чэмпіянат Еўропы. Мужчыны.
18.20 Фактар сілы.
18.50 Хакей. КХЛ.
23.35 Тэніс. ВТА.

АНТ

6.00, 7.15, 8.15, 9.00 «Наша раніца».
7.00, 8.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00 [СЦ], **20.30, 0.45** Нашы навіны.
7.10, 8.10 «Трывожная кнопка» (16+).
9.10 «Аб'ектыўНа» (16+).
10.10 «Жыць здорава!» (16+).
11.15 «Модны прыгавор» (6+).
12.20 «Бесталковыя нататкі» (12+).
13.15, 23.05 Серыял «Курт Сеіт і Аляксандра» (16+).
15.00 «Давай пажэнімся!» (16+)
16.20 «Мужчынскае / Жаночае» (16+).
17.20, 18.20 «На самай справе» (16+).
18.50 «Удача ў прыдачу!» (12+)
18.55 «Няхай гавораць» (16+).
20.00 Час.
21.15 «Маркаў. Нічога асабістага» (16+).
21.55 Серыял «Рускія горкі» (16+).

СТБ

6.00, 6.40, 7.45 «Раніца СТБ».
6.30 [СЦ], **7.30** [СЦ], **8.30** [СЦ], **10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** Навіны.
9.00, 0.10 «Загадкі чалавецтва з Алегам Шышкіным» (16+).
10.00 «Глядзець усім!» (16+)
10.40 «Як уладкаваны свет» (16+).
12.20, 20.45, 1.00 «Самыя шакавальныя гіпотэзы» (16+).
13.45, 23.20 «Таямніцы Чапман» (16+).
14.30, 21.35 «Неверагодна цікавыя гісторыі» (16+).
15.20, 16.50 «Масгаз. Формула помсты». Серыял (16+).
20.15, 23.15 «СТБ спорт».
20.20 «Сталічныя падрабязнасці».
20.30 «Міншчына».

МІР

5.00, 10.10, 23.25, 4.10 Серыял «Даішнікі» (16+).
10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Навіны. Бягучы радок.
13.15, 3.25 «Справы судовыя. Грошы вярніце!» (16+)
14.10, 18.00 «Справы судовыя. Бітва за будучыню» (16+).
15.05, 16.20 «Справы судовыя. Новыя гісторыі» (16+).
17.00 «Міравое пагадненне» (16+).
19.25, 20.15 «Гульня ў кіно» (16+).
21.00, 22.00 Шоу «Назад у будучыню» (16+).
22.55 «Сусветныя гульні розуму» (16+).

РТР—Беларусь

6.05 «Новая раніца».
11.00, 14.00, 17.00, 20.00 Весткі.
11.30 «Пра самае галоўнае» (12+).
12.35, 14.35 Серыял «Таямніцы следства» (16+).
13.50, 16.50, 19.50, 23.00 Навіны — Беларусь.
15.40 «Кропкі над і» (16+).
17.15 «60 хвілін».
18.30 «Андрэй Малахаў. Прамы эфір» (16+).
21.05 Серыял «Шуша» (16+).
23.10 «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым» (12+).

НТБ—Беларусь

6.00 «Астрапрагноз».
6.05, 7.10, 8.20, 16.20, 19.40, 21.45, 23.20 Сёння. Галоўнае.
6.10 Спорт-мікс.
6.20 «Здароўе» (12+).
7.25 «Маршрут пабудаваны» (12+).
8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Сёння.
8.35 Сфера інтарэсаў.
8.55, 21.50 «НЗ.by».
9.15 Гісторыі выратавання (12+).
9.50, 10.25 Серыял «Званар» (16+).
11.10 Серыял «Ляснік» (16+).
13.25 Надзвычайнае здарэнне.
13.55 Серыял «Чужы раён» (16+).
16.30 «За гранню» (16+).
17.25 «ДНК» (16+).
18.30, 19.55 Дэтэктыў «Метад Міхайлава» (16+).
22.10, 23.35 Дэтэктыў «Балабол-3» (16+).

8 канал

7.00,14.15, 17.10, 21.05, 00.35 «Надвор'е» + «Эрана».
7.05 М/ф. «Трансформеры прайм» (6+).
7.30, 14.20, 20.45 «Прыколы 13-й школы» (6+).
7.35 М/ф. «Цёмны крышталь» (12+).
8.30 Серыял «Лок і ключы» (16+).
9.15, 14.55 Серыял «Служба выратавання 911» (16+).
10.00 «Бразілія» (12+).
10.45 Маст. фільм «Фарсаж» (16+).

12.35 Серыял «Яна напісала забойства» (12+).
14.25 «Дом Савы» (0+).
14.45, 17.55 «Хачу ў Парыж» (12+).
15.40 Серыял «Чорна-белае каханне» (16+).
16.25 «7 цудаў».
17.15 Серыял «Тэорыя Вялікага выбуху» (16+).
18.00 Серыял «Непрыдуманая гісторыя» (12+).
19.30 «Фэшн is my прафэшн» (12+).
19.45 Серыял «МакМафія» (18+).
20.50 «Вечарніца» (0+).
21.10 Драма «Пахавайце мяне за плінтусам» (16+).
23.00 Серыял «Клікбейт» (18+).

ВТБ

6.00, 8.55, 9.55, 12.50, 13.55, 15.55, 16.55, 19.55, 23.05, 23.55 Прагноз надвор'я.
6.05, 14.00 «Раніца з гумарам» (16+).
9.00, 23.10 «КВЗ. Па-нашаму» (16+).
10.00 «Гатовім як шэф» (16+).
10.35 «Дурні і дарогі» (16+).
10.55 «Дружба і ніякага сексу?» (12+)
12.55 «Уральскія пельмені» (16+).
16.00 Серыял «Вароніны» (12+).
17.00 Серыял «Гранд» (16+).
20.00 Серыял «Гатовыя на ўсё» (16+).
21.00 «Вясельны перапалох» (12+).
0.00 Серыял «Псіхалагіні» (16+).
1.00 Серыял «Анжаліка» (16+).
2.00 Серыял «Маладзёжка» (16+).
3.35 «Адна за ўсіх» (16+).
4.45 «6 кадраў» (16+).

Культура

6.30, 7.00, 7.30, 8.30, 10.00, 15.00, 19.30, 00.00 Навіны культуры.
6.35 «Пешшу...»
7.05 «Правілы жыцця».
7.35 «Старажытныя нябёсы» [СЦ].
8.35 Дарогі старых майстроў.
8.45 Легенды сусветнага кіно.
9.15, 20.45 «Сімфанічны раман» [СЦ].
10.15 «Назіральнік».
11.10, 1.15 XX стагоддзе.
12.25 «Шахеразада».
13.30 «Абсалютны слых».
14.15 Галівуд Краіны Саветаў.
14.30 «Сімон Шноль. Ад 0 да 80» [СЦ].
15.05 Навіны. Падрабязна. Тэатр.
15.20 Пернікавы домік [СЦ].
15.45 «2 Вернік 2».
16.30, 22.15 «Аптымісты».
17.25 Юбілей ДАСА.
18.35 Прыступкі цывілізацыі [СЦ].
19.45 «Галоўная роля».
20.05 Адкрытая кніга.
20.30 «Добрай ночы, малыя!»
21.30 «Энігма. Сара Уіліс».
23.05 Колер часу.
23.15 «Вінаватасць даказаная» [СЦ].
0.20 «Фабрыка часу» [СЦ].
2.25 Раман у камені.

Настальгія

6.00 «Быў час» (16+).
7.15 Маст. фільм «Насця» (16+).
6.50, 8.35, 9.40, 11.00, 11.40, 14.20, 15.40, 17.00, 18.55, 20.40, 21.40, 23.00, 00.55, 2.40, 3.40, 5.00, 5.40 Музычная настальгія (12+).
9.00, 15.00, 21.00, 3.00 «Мінулы час» (12+).
10.00, 16.00, 22.00, 4.00 «Народжаныя ў СССР».
11.30, 5.30 «Мастак і паэт Міхаіл Гробман чытае свае вершы» (18+).
12.00 «Спяем, сябры!» (12+)
13.00 Маст. фільм «Самазабойца» (18+).
18.00 «Яловая субмарына» (18+).
19.15 Маст. фільм «Адзінокая жанчына жадае пазнаёміцца» (16+).
0.00 «СевАлогія» (18+).
1.15 Маст. фільм «Інспектар крымінальнага вышуку» (16+).

EuroSport 1

0.05, 22.20 Навіны (6+).
0.10, 6.00, 12.30, 18.05, 19.00 Веласпорт (трэк). ЧЕ. Грэнхен (12+).
1.00, 10.30 Гольф. Тэлечасопіс GolfTV Weekly (6+).
1.30 Трыятлон. Суперліга. Малібу (12+).
2.30 Тэлечасопіс «Жывыя легенды» (12+).
3.00 Алімпійскія гульні. Тэлечасопіс «Зала славы» (12+).
4.00, 8.00 Снукер. Northern Ireland Open. (6+).
9.30 Алімпійскія гульні. Тэлечасопіс «Алімпійскі суддзя» (12+).
11.00 Вольная барацьба. Чэмпіянат свету (12+).
11.30 Тэніс. Кубак Лэйвера (6+).
14.00, 22.25 Веласпорт. Сусветны тур. Жанчыны (12+).
15.00 Веласпорт. «Мілан — Турын». Мужчыны (12+).
16.20, 23.25 Веласпорт. «Гран П'емонце». Мужчыны.
22.15 Тэлечасопіс The Minute (12+).

Кінакамедыя

1.55 «Спакуснік» (16+).
4.50 «Спакуснік-2» (16+).
7.05 «Халоп» (12+).
9.05 «Алёша Паповіч і Тугарын Змей» (12+).
10.35 «Дабрыня Мікіціч і Змей Гарыныч» (6+).
11.50 «Ілья Мурамец і Салавей Разбойнік» (12+).
13.20 «Дзікая парачка» (16+).
15.15 «Тры волаты і Шамаханская царыца» (12+).
16.40 «Тры волаты: ход канём» (6+).
18.00 «Тры волаты і марскі цар» (6+).
19.30 «Маска» (12+).
21.20 «Хто ведае...» (16+)
23.35 «З рэчамі на вылет!» (16+)

ТБЗ

6.00 Калекцыя «Беларусьфільма» (12+).
7.55 «Яшчэ пра вайну» (12+).
9.00 «Улегцы» (12+).
9.40 «Каралёк — птушачка пявучая». Серыял (16+).
11.30 «Урачы» (16+).
12.35, 18.00 «Сляпая» (16+).
13.40, 19.10, 4.05 «Варажбітка» (16+).
14.15 «Старац» (16+).
14.55, 4.30 «Суд ідзе» (16+).
16.00 «Пятая варта». Серыял (16+).
20.25 «Звышнатуральнае». Серыял (16+).
23.15 «Фантом» (16+).
0.25 «10 самых» (16+).
1.00 «Зніклая» (16+).
3.25 «90-я» (16+).

ТБ1000

5.20, 6.00, 17.15, 18.05 Доктар Хаус (16+).
6.50 Гары і Хендэрсаны (12+).
8.55 Дом каля возера (12+).
10.45 Практычная магія (16+).
12.40, 14.55 Галодныя гульні: Сойка-перасмешніца (16+).
19.00 Век Адалін (16+).
21.00 Кейт і Леа (12+).
23.10 Інтуіцыя (12+).
0.50 Раён № 9 (16+).
2.35 Ультрафіялет (16+).
4.00 Прывідны патруль (12+).

ТБ1000 Рускае кіно

5.10 Наша Russia. Яйкі лёсу (16+).
6.35 ПіраМММіда (16+).
8.30, 15.35 Красуня ва ўдары (12+).
10.15 Увесь гэты джэм (16+).
11.55, 4.40 Марафон жаданняў (16+).
13.35 Гуляй, Вася! Спатканне на Балі (16+).
17.20, 17.55 Насця, набярыся смеласці! (16+).
18.30 Дзяўчаты бываюць розныя (16+).
20.05 Гараскоп на ўдачу (12+).
21.55 Мой хлопец — анёл (16+).
23.35 Каханне з абмежаваннямі (16+).
1.25 Лета (18+).
3.20 Кахае не кахае (16+).

National Geographic

6.00 Як перамагаць ва ўсім (16+).
6.40 Машыны: разабраць і прадаць (16+).
7.30 Аўта-SOS (16+).
8.25 Ледзяная дарога (16+).
9.15 Суперкар са сметніка (16+).
10.05 Рыбы-пачвары (16+).
11.00, 12.40 Дзікі тунец (16+).
11.50 Дзікі тунец: Поўнач супраць Поўдня (16+).
13.25 Таямніцы светабудовы (16+).
14.15, 15.10 Космас: магчымыя сусветы (16+).
16.00 Сапраўдны геній са Стывенам Хокінгам (16+).
16.50, 17.45 Марс (16+).
18.30 Касмічны шатл: трыумф і трагедыя (16+).
19.20, 20.05 Расследаванні авіякатастроф (16+).
21.00, 00.20, 3.20 Аляска: новае пакаленне (16+).
21.50 Злавіць кантрабандыста (16+).
22.40 Эвакуацыя Зямлі (16+).
23.30 Гісторыі выратавання (16+).
1.05 Востраў бунтароў (16+).
1.50 Ліхтугі за мяжой (16+).
2.40 Ліхтугі за мяжой: злачынства і пакаранне (16+).
4.05 Крывавыя таямніцы Еўропы (16+).
4.50 Навуковыя глупствы (16+).

Discovery

8.00, 10.15, 10.40, 13.55, 14.20, 14.50, 15.15, 15.45, 21.15, 21.40, 7.35 Як гэта ўладкавана? (12+)
8.25, 11.10, 16.40, 22.10 Махінатары (12+).
9.20, 9.45, 20.20, 20.45 Склады: бітва ў Канадзе (16+).
12.05 Голыя і напалоханыя XL (16+).
16.10 Прыгожае жыццё (12+).
17.35 Як уладкаваны Сусвет (12+).
18.30, 18.55 Кафэ, закусачныя і забягалаўкі (12+).
19.25, 4.27 Хуткія і гучныя (12+).
23.05, 00.00, 00.55, 5.14, 6.01, 6.48 Залатая ліхаманка (16+).
1.50, 2.15, 2.45, 3.10, 3.40, 4.04 Бітвы за кантэйнеры (12+).

У праграме магчымы змяненні. Перадрукоўка праграмы забаронена. [СЦ] – фільм транслюецца са скрытымі субцітрамі.

Ад бытавых тэм да праблем шырокага маштабу

Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Таццяна РУНЕЦ правяла прамую тэлефонную лінію.

Людзі традыцыйна звярталіся па самых розных пытаннях з надзеяй знайсці падтрымку ў сенатара. Жыхарка вёскі Нялідавічы Мінскага раёна Марыя Антонаўна скардзілася на тое, што ў вёсцы прыкладна два кіламетры дарогі пакінутыя без належнага рамонту. Куды і ў якія інстанцыі ні звярталіся з просьбай дапамагчы ў вырашэнні праблемы — безвынікова. Таму адна надзея — на дапамогу сенатара.

Званок з Оршы нагадаў бабруйскую гісторыю, калі ў вачах насельніцтва добрую ідэю па рэканструкцыі старых будынкаў пад жыллё скампраметавалі прайдзісветы, якія падманам вымanілі ў людзей грошы ўзамен на кватэры. Грошы ўзялі, потым збеглі і схаваліся за мяжой, а тыя, хто пацярпеў, пішуць скаргі куды толькі можна, патрабуюць вярнуць ім грошы. На думку Таццяны Рунец, акрамя іншага, гэты выпадак сведчыць і пра неабходнасць павышаць юрыдычную адукаванасць насельніцтва. Людзі перад подпісам павінны ўважліва чытаць тэксты пагадненняў, дагавораў, іншых дакументаў, каб не трапіць у пастку махляроў. Але з-за сваёй прававой недасведчанасці церпяць нярэдка вялікія матэрыяльныя страты.

Тэлефанавалі з нестандартнымі просьбамі. Так, адна жанчына выкупіла ў сельсавета пад дачу стары будынак былой школы за тры базавыя велічыні. Але потым, калі ўважліва агледзелася, падлічыла верагодныя выдаткі, моцна расчаравалася ў набыцці. Бо рамонт абяцаў быць доўгім і дарагім. Адсюль і просьба да сенатара: дапамажыце зрабіць так, каб сельсавет забраў будынак назад.

Жыхары Мінска і Барысава звярталіся з просьбамі разабрацца ў канфліктах з суседзямі, бо мясцовыя ўлады бяздзейнічаюць.

У ходзе тэлефоннай лініі суразмоўцы сенатара прапаноўвалі самыя розныя тэмы і ставілі пытанні, вырашэнне якіх выходзіла за межы паўнамоцтваў членаў верхняй палаты парламента. І часам

можна было пазайздросціць вытрымцы, спакою і спагадлівасці Таццяны Рунец у размовах асабліва з так званымі старымі знаёмым, з тымі, хто ўжо не першы раз звяртаецца ў Савет Рэспублікі, як і ў іншыя інстанцыі, з адной мэтай — «прабіць» выгаднае для сабе рашэнне ці адмяніць пастанову суда і г. д. Але былі і слушныя прапановы.

Як потым адзначыла Таццяна Рунец, прамыя тэлефонныя лініі дазваляюць сенатарам выслухаць людзей, даведацца аб іх праблемах і па меры магчымасці паспрабаваць іх вырашыць.

Асобная тэма: будаўніцтва, утрыманне і рамонт дарог у пасёлках і сельскіх населеных пунктах. Але дарогі — справа нятанная, таму і няхуткая. У органах мясцовай улады на гэтыя мэты сродкі абмежаваныя, усе дарогі адразу нельга адрамантаваць. Таму на месцах трэба растлумачваць людзям, калі іх дарога будзе ўнесена ў план па рамонце, у якія тэрміны яго зробяць. З людзьмі трэба ўмець размаўляць, лічыць сенатар. На яе думку, увогуле зваротная сувязь з грамадзянамі дазваляе лепш разумець пытанні і праблемы, якія хвалююць людзей у рэгіёнах.

Мікалай ЛЮБЧАНСКІ, фота аўтара.

«Хакей з майго жыцця нікуды не сыдзе»

Сенатар Дзмітрый БАСКАЎ правёў свой першы прыём грамадзян у якасці члена Савета Рэспублікі.

У сераду, 29 верасня, экс-старшыня Федэрацыі хакея Беларусі сустрэўся з заяўнікамі: усяго на прыём да яго запісаліся 23 чалавекі, але былі і тыя, хто прыйшоў па-за спісаў, — прыняў усіх.

Праблематыка пытанняў была самая шырокая: ад спорту да апякунства. Да Дзмітрыя Баскава, безумоўна, больш звярталіся па вырашэнне пытанняў у больш профільным для яго кірунку — спартыўным. Ды і месца правядзення прыёму гэтаму садзейнічала: сустрэча праходзіла на базе дзіцяча-юнацкай школы алімпійскага рэзерву «Дынама», якую Дзмітрый Баскаў узначальваў пяць гадоў.

У прыватнасці, Эдуард Анатольевіч прыехаў са сваім непаўналетнім сынам з Данецка. Падлетак займаецца хакеем, і яго бацька хацеў бы, каб той у будучыні змог выступаць у складзе Нацыянальнай зборнай Беларусі, таму просіць дапамагчы з атрыманнем беларускага пашпарта. Па словах сенатара, гэтае пытанне неаднаразова ўзнімалася на ўзроўні Мінспорту, але пакуль станоўча не вырашана, таму прапануе заняцца ім у індывідуальным парадку.

Яшчэ адзін наведвальнік, Леанід Сяргеевіч, выказаў прапанову ўдакладніць статыстыку гульцоў у Вышэйшай лізе. Як бацька сыноў-спартсменаў, якім 17 і 19 гадоў адпаведна, яго вельмі хвалюе гэта пытанне.

Тытулаваны баксёр, майстар спорту Беларусі Вазген Сафар'янц агучыў асабістае пытанне, якое датычылася парушэння спартыўнай дысцыпліны. Спартсмен прасіў садзейнічання ў станоўчым вырашэнні праблемы.

Але былі і тэмы, далёкія ад спорту: падзел кватэры з былой жонкай, пытанні апякунства і іншыя.

Як патлумачыў у гутарцы з журналістамі сенатар, ён пакуль паглыбляецца ва ўсе працэсы парламенцкай дзейнасці. Нагадаем, што прызначэнне Дзмітрыя Баскава членам Савета Рэспублікі адбылося 14 верасня.

— Асноўная мая дзейнасць будзе скіравана на сацыяльнае развіццё, — адзначыў ён. — Таму што тэма спорту мне бліжэйшая за ўсё. Што датычыцца астатніх пытанняў сацыяльнай палітыкі, я буду ўдзельнікам камісіі Савета Рэспублікі (па адукацыі, культуры, навуцы і сацыяльным развіцці. — **Заўв. аўт.**), дзе ёсць дасведчаныя людзі, якія падкажуць і дапамогуць хутка сарыентавацца ў тым ці іншым пытанні.

Ён падкрэсліў: заўсёды трэба вучыцца ў людзей, якія прайшлі большы жыццёвы шлях, і прыслухоўвацца да калег, якія маюць большы прафесійны вопыт.

— Што да майго вопыту, натуральна, па пытаннях развіцця спорту мне будзе лёгка, — лічыць сенатар. — Па некаторых пытаннях, якія ўжо агучваюць людзі (у тым ліку тэма апякунства) маю ўласны вопыт: я калісьці быў апекуном свайго непаўналетняга пляменніка — мне ёсць што параіць і на што сарыентаваць.

Даючы ацэнку эфектыўнасці такой формы работы, як прыёмы грамадзян, Дзмітрый Баскаў перакананы, што гэта абсалютна добрая справа:

— Я бачыў (на прыёме грамадзян Наталляй Качанавай у Ляхавічах. — **Заўв. аўт.**), як некаторыя пытанні аператыўна вырашаюцца адразу, а якіясьці, натуральна, бяруцца на кантроль, і прыкладваецца максімум намаганняў, каб дапамагчы кожнаму чалавеку, які прыходзіць са сваёй праблемай.

Не засталася па-за ўвагай журналістаў і хакейная тэма: у хуткім часе Федэрацыі хакея Беларусі давядзецца абіраць новага лідара. Дзмітрый Баскаў расказаў, што на гэтую пасаду ёсць некалькі кандыдатаў, што дае магчымасць вызначыцца з самым годным сярод іх.

Разважаючы аб ролі хакея, сенатар падкрэсліў:

— Безумоўна, хакей з майго жыцця нікуды не сыдзе — гэта мая любімая справа, якой я прысвяціў усё сваё жыццё, — акцэнтуе ён. — Юрыдычна, вядома ж, у ім працаваць не буду, але мой новы кірунак (член Савета Рэспублікі) не проста дае магчымасць займацца хакеем — ён абавязвае паглыбляцца ў спорт у цэлым і ў хакей у прыватнасці.

Вольга АНУФРЫЕВА.

Усё больш слушных прапаноў

Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргей РАЧКОЎ правёў асабісты прыём грамадзян.

Прыём наведвальнікаў пачаўся з грунтоўнай размовы з групай жанчын, якія сёння прыйшлі з пэўнымі прапановамі па ўдасканаленні работы судовай сістэмы і праваахоўных органаў, па павышэнні эфектыўнасці барацьбы з распаўсюджваннем наркотыкаў, асабліва па ўзмацненні барацьбы з гандлем наркотыкаў праз інтэрнэт, пашырэнні прафілактычнай работы ў маладзёжным асяроддзі. Бо, на погляд жанчын, з цягам часу наркаманія, на вялікі жаль, істотна памаладзела. Таму таксама ўзнялі пытанне і аб паляпшэнні практыкі сацыяльнай рэабілітацыі тых хлопцаў і дзяўчат, якія выйшлі на свабоду пасля турмы. Ім трэба дапамагчы хутчэй уладкавацца ў жыцці, знайсці работу, зрабіць многае іншае, каб яны зноў не вярнуліся да наркотыкаў.

У ходзе размовы Сяргей Рачкоў выказаў падтрымку жанчынам за тое, што яны неабыякавыя, не супакойваюцца, а знаходзяць мужнасць разам з іншымі аднадумцамі супрацьстаяць страшнай навале, вялікай бядзе, шукаць шляхі выкаранення гэтай хваробы грамадства. І такі пастаянны дыялог вельмі важны, падкрэсліў старшыня профільнай камісіі.

Частка іншых зваротаў таксама датычылася пэўных складаных жыццёвых сітуацый, у якія нярэдка трапляюць людзі з-за сваёй празмернай даверлівасці, неасцярожнасці, неабачлівасці да не зусім нармальных і часам агрэсіўных паводзін тых, з кім жанчыны вырашаюць звязаць свой лёс. У такой складанай сітуацыі апынулася прадпрымальніца Ларыса Анатольеўна, якая сёння моцна пакутуе ад былога, скажам так, сябра сэрца, а цяпер яе галоўнага ворага.

Ён, дарэчы, грамадзян адной з краін СНД, член крымінальнай этнічнай групоўкі, апошнім часам жыццё Ларысы Анатольеўны ператварыў у пекла: не толькі пастаянна запалохвае на словах, але і падпаліў яе чатырохпакаёвую кватэру, спаліў адзін з яе дамоў, нішчыць аўтамабілі, іншую маёмасць, пагражае смерцю ёй і яе дзецям, імкнецца прыхапіць яе бізнес і г. д.

Па ўсім відаць, Сяргею Рачкову цяжка было слухаць споведзь жанчыны, якая па дапамогу вырашыла звярнуцца ў Савет Рэспублікі. Зразумела, яе зварот быў зафіксаваны і ўзяты на кантроль. Бо, сапраўды, крыўдзіцель жанчыны, між іншым, знаходзіцца ў вышуку і супрацьяго ўзбуджана крымінальная справа. Аднак сенатар параіў Ларысе Анатольеўне ўсё ж дакладна выкласці сутнасць пытання ў праваахоўных органах.

Потым у размове з журналістамі Сяргей Рачкоў адзначыў, што кожны наведвальнік прыйшоў са сваімі пытаннямі, якія нярэдка ўзнікаюць у ходзе вырашэння злабадзённых і часам заблытаных жыццёвых праблем. Па меры магчымасці ў Савеце Рэспублікі імкнуцца дапамагчы людзям, зразумела, у межах дзеючага заканадаўства.

Радуе і тое, кажа суразмоўнік, што ўсё часцей людзі звяртаюцца да сенатараў з канкрэтнымі слушнымі прапановамі, цікавымі ідэямі. Напрыклад, сёння адзін з наведвальнікаў выказваў вартыя ўвагі думкі па ўдасканаленні работы з беларускай дыяспарай за мяжой на карысць нашай краіны.

Леанід ТУГАРЫН.

АКТУАЛЬНА

Спадчынніцу знайшлі ў Калумбіі

Нядаўна на пасяджэнні Віцебскага аблвыканкама былі разгледжаны пытанні выкарыстання дзяржаўнай маёмасці. У ім па відэасувязі браў удзел старшыня Палаты прадстаўнікоў Уладзімір Андрэйчанка.

У рэжыме відэаканферэнцсувязі таксама ўдзельнічалі кіраўнікі і адказныя за гэты вектар дзейнасці ў райгарвыканкамах.

Спікер ніжняй палаты беларускага парламента нагадаў пра тое, што ў канцы красавіка старшыні аблвыканкамаў былі запрошаны на нараду да Прэзідэнта, падчас якой абмяркоўвалася і пытанне необходнасці зносу непрыдатных будынкаў і збудаванняў сельскагаспадарчых арганізацый, як і тых, якія не выкарыстоўваюцца. Трэба ўцягваць у гаспадарчы абарот зямельныя ўчасткі, дзе стаялі фермы, майстэрні, сушылкі і іншае. Быў агучаны канкрэтны тэрмін завяршэння працэсу — да 1 мая 2024 года, нагадаў Уладзімір Андрэйчанка. У Віцебскай вобласці такіх аб'ектаў парадку 470.

Старшыня аблвыканкама Мікалай Шарснёў паставіў задачу весці адпаведную работу больш актыўна і сістэмна.

Што датычыцца іншай нерухомасці, сёлета Прыдзвінскі край — лідар па колькасці аб'ектаў, якія былі прададзены і іншым чынам цяпер працуюць на эканоміку.

У вобласці ў перыяд са студзеня да жніўня ўцягнулі ў гаспадарчы абарот і знеслі 150 аб'ектаў з запланаваных каля 480. Каб прыцягнуць яшчэ большую колькасць інвестараў, камітэтам «Віцебскаблмаёмасць» быў створаны дадатковы спіс з назвамі прыблізна дзевяноста аб'ектаў, якія можна атрымаць, каб выкарыстоўваць на вельмі прывабных умовах пад рэалізацыю інвестыцыйных праектаў. І ў бягучым годзе прыблізна дзесяць аб'ектаў ужо перададзены.

Яшчэ ёсць пералік будынкаў, якія ўяўляюць сабой гісторыка-культурную каштоўнасць. У ім засталося пятнаццаць аб'ектаў.

Дарэчы, найбольш часта на аўкцыёнах купляюць «сцены» за базавую велічыню ці калі кошт паніжаны на 80 %.

Добра наладжана работа па зносе прыватнага жылля, якое не патрэбна нашчадкам і спадчыннікам.

Старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў Уладзімір Цярэнцьеў канстатаваў, што сёлета на 143 % выкананы знос у глыбінцы. І распавёў пра тое, як пошук уладальнікаў «метраў» вядзецца нярэдка і з міжнародным размахам. Напрыклад, у адным з раёнаў гаспадыня хаты з'ехала ў ЗША, правы спадчыны перайшлі дачцэ, якую ў сельскім выканкаме знайшлі ў Калумбіі. Яна падпісала адпаведны дакумент, што не мае прэтэнзій на валоданне домам. І цікавых прыкладаў, за якімі цяжкая пошукавая праца, нямала.

Задача заўсёды будзе актуальнай, каб нерухомасць прыносіла карысць: быў у яе гаспадар, ствараліся новыя працоўныя месцы, плаціліся падаткі і гэтак далей, а не наадварот, калі з бюджэтаў вылучаюцца немалыя сумы грошай на падтрыманне аб'ектаў у належным стане, іншыя выдаткі.

Кіраўніком абласной вертыкалі выканаўчай улады ў канцы няпростай размовы пра нерухомасць была падкрэслена важнасць правядзення гэтай работы з мэтай навядзення парадку на зямлі. Была адзначана неабходнасць наладжвання супрацоўніцтва з усёй вертыкаллю ўлады, прадпрыемствамі і інвестарамі. Ёсць неабходнасць разгляду ўсіх магчымых варыянтаў уключэння маёмасці ў гаспадарчы абарот.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

АБУДЗІЦЬ УСПАМІНЫ...

Болей чым 600 біяграфій

Пасля прыезду дэлегат пачала абыходзіць школы і працоўныя калектывы. І ўсім задавала адны і тыя ж пытанні: «Што вы ведаеце пра сваіх продкаў, якія перажылі вайну? На якіх франтах яны ваявалі? Як яны жылі ў тыле? якія трагічныя ўспаміны не даюць спакою і сёння?»

> «Ёсць біяграфія вязня з Азарычаў, які ў падрабязнасцях апісвае розныя жахі, прызнанні тых, хто вызваляў Асвенцым і на свае вочы бачыў горы пінетачак — ад гэтых успамінаў стыне кроў».

— Я бачыла людзей, якія нічога не ведаюць і нават не задумваліся над гэтым, — кажа яна. — Але знайшлося і шмат такіх, у якіх на руках бясцэнныя матэрыялы і яны нідзе не публікаваліся. Гэта дзённікі ветэранаў, успаміны вязняў канцлагераў, людзей, якія жылі пад акупацыяй. Раней сітуацыя была іншая, усе перажылі цяжкія падзеі, страты, гора, і гэта ўспрымалася як трагедыя народа. Але цяпер усё гэта стала персаніфікаваным. На жаль, шмат матэрыялаў страчана, але шмат і захавалася. І мне падалося, што было б добра, калі б акцэнтаваць увагу моладзі на ўклад непасрэдна іх сям'і ў агульную Перамогу. Адным словам, стварыць своеасаблівую кнігу.

— Калі Галіна агучыла гэтую ідэю, нам яна спадабалася, — успамінае, як усё пачыналася, **старшыня Магілёўскага гарсавета Максім ГУРЫН**. — Мы перагаварылі з намеснікам старшыні гарвыканкама Алай Галушкай, начальнікам гарадскога ўпраўлення па адукацыі Ірынай Рыбаковай і на сваім дэпутацкім «вечы» вырашылі рэалізаваць праект. Кінулі кліч праз раённыя аддзелы адукацыі, школы, каб падзяліліся звесткамі пра ваеннае мінулае сваіх продкаў. Прычым заклікалі не толькі дзяцей, але і дарослых. І за паўгода назбіралася болей чым 600 такіх біяграфій. Мы знайшлі спонсараў, і ў канцы кастрычніка ўбачыць свет кніга ў прыватным магілёўскім выдавецтве «Амелія Прынт».

(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.)

Для сённяшніх дзяцей гэта кніга стане блізкай перш за ўсё тым, што там ёсць радкі і пра іх сем'і. Яна стане арыенцірам у жыцці, запаветам ад родных захоўваць і берагчы родную зямлю і, галоўнае, яшчэ адным напамінам, якое гэта вялікае гора — вайна.

Праект выйшаў за межы школы

У будучай кнізе каля 600 старонак, болей чым тысяча фота і дакументаў. Біяграфіі дапоўнены архіўнымі звесткамі з фондаў Міністэрства абароны Расійскай Федэрацыі.

— Я спецыяльна шукала гэтую інфармацыю, каб узмацніць некаторыя звесткі, — расказвае Галіна Бяляева. — Калі знаходжу ўзнагародны ліст, неразвонваю родным, зачытваю подзвіг і прапаную ўнесці ў гісторыю. І часцей за ўсё людзі прызнаюцца, што нават нічога не ведалі пра гэта. Франтавікі не любілі хваліцца. Калі чытаеш, што танк героя быў падбіты, а ён выскачыў з палаючай машыны і бег перад нашымі, каб паказаць бяспечны шлях, родныя па-іншаму пачынаюць глядзець на свайго продка. Або, напрыклад, напісана, што чалавек атрымаў узнагароду за тое, што за 13 дзён аднавіў мост, на рамонт якога рэальна патрэбна было каля двух месяцаў. Схіляеш галаву перад яго подзвігам, бо чалавек, не шкадуючы сябе, працаваў, каб савецкія войскі змаглі хутчэй пераправіцца і вызваліць Беларусь. Гісторыі кранаюць душу, таму што праз гэтыя дзённікі ты бачыш не нейкіх там манументальных герояў, а жывых людзей.

Першапачаткова праект прызначаўся для школьнікаў, навучэнцаў, студэнтаў. Спачатку сапраўды адгукаліся дзеці, потым ініцыятыву ўзялі ў свае рукі іх бацькі, зараз інфармацыя распаўсюдзілася далёка за межы Магілёва, і стваральнікам ідуць лісты з іншых абласцей і нават краін.

— Адна жанчына прызналася, што праект прымусіў яе сям'ю сабрацца ў доме дзеда, яшчэ раз успомніць яго як чалавека і франтавіка, — расказвае Галіна Бяляева. — Мы і ставілі перад сабой мэту, каб тэма аб'яднала людзей. Але нават не чакалі, наколькі ўнікальныя матэрыялы захоўваюцца на руках. Мне перадалі дзённік з фотаздымкамі байца 110-й стралковай дывізіі, якая абараняла прыгарад Магілёва. Гэтую дывізію гісторыкі называюць мёртвай, бо з яе выжыла мала людзей. Засталося ўсяго 20 задакументаваных успамінаў. І тут у рукі мне трапляе рарытэт. Пісаў баец 425-га стралковага палка. Я, калі атрымала ўспаміны, адразу ж патэлефанавала кіраўніку абласнога гісторыка-патрыятычнага пошукавага клуба «Віккру» Мікалаю Барысенку. Ад яго даведалася, што якраз на наступны дзень пошукавікі едуць у Шклоўскі раён падымаць байцоў гэтага палка. І я з вучнямі-добраахвотнікамі паехала разам з імі. Уяўляеце, аднакласнікі хлопчыка, які прынёс гэты дзённік, дапамагалі падымаць байцоў, з якімі, магчыма, яго прадзед стаяў у адным страі.

Сюжэт для фільма

Выданне, што ствараюць дэпутаты, называецца «Вялікая Айчынная вайна: сапраўдныя гісторыі». Гэта не камерцыйны праект, кнігі пойдуць у бібліятэкі, архівы, установы адукацыі. Будзе выдадзена ўсяго 150 асобнікаў. Пра некаторых відавочцаў там усяго 5-6 радкоў, але шмат біяграфій, якія займаюць некалькі старонак. Па матывах успамінаў Юрыя Палухіна наогул можна здымаць фільм. Ён ляжаў у шпіталі і падрабязна апісаў, як паміж яго таварышам па палаце танкістам Жорам і медсястрой Ганнай Смірновай зараджалася каханне. Ён піша, што Ганна была яркай не столькі знешне, колькі знутры. А Жора быў неверагодна прыгожы і мужны. Ганна не магла ў яго не закахацца.

— Чытала і перажывала — так хацелася, каб у гэтых людзей усё было добра, — дзеліцца Галіна Бяляева. — Жора прызнаваўся Юру, што Ганна яго лёс і яго пачуццё да яе — на ўсё жыццё. А праз паўгода Юра зноў трапіў у шпіталь і даведаўся, што Жора загінуў пры вызваленні адной з вёсак пад Магілёвам. Для Ганны гэта быў страшэнны ўдар. Аўтар дзённіка сам перажываў гэтую трагедыю. Нават эмацыянальна пазначаў: хай будзе праклятая гэтая вайна, якая разбіла шчасце такіх прыгожых людзей. Потым я знайшла ў архіўных дакументах, што танкіст, лейтэнант Рыгор Арсеньевіч Снурнікаў загінуў 28 чэрвеня 1944 года пры вызваленні вёскі Шапчыцы Магілёўскага раёна...

Дзённікі, лісты з фронту, успаміны — жывы чалавечы боль і туга. Галіна Бяляева прызнаецца, што нават ноччу не можа заснуць, пракручвае ў галаве некаторыя гісторыі.

— Мы сёння зусім не задумваемся, навошта нашу моладзь зганялі ў Германію, — кажа яна. — Адказ у гэтых прызнаннях. Акупантам патрэбны былі людзі, якія працавалі б на шкодных вытворчасцях у хімічнай прамысловасці. Маладыя людзі хутка паміралі, таму што праз некалькі месяцаў работы ў іх ужо лёгкіх не было. Запала ў душу гісторыя дзяўчынкі, у якой да апошняга бралі кроў, а потым ледзь жывую выкінулі за агароджу. Яе падабрала нямецкая жанчына, у якой было восем дзяцей, і чацвёра з іх ваявалі ў нас на франтах. Жанчына выхадзіла тую дзяўчынку. Юра Палухін піша, што гітлераўцы, калі прыехалі ў яго вёску, хадзілі па дамах і расстрэльвалі дзяцей. І ён ні разу не бачыў, каб такое рабілі чырвонаармейцы. У Германіі ён уразіўся капітанам, які адной рукой камандаваў батарэяй, а на другой трымаў кінутую трохгадоваю нямецкую дзяўчынку. Дзіця называла яго «папі». Ёсць біяграфія вязня з Азарычаў, які ў падрабязнасцях апісвае розныя жахі, прызнанні тых, хто вызваляў Асвенцым і на свае вочы бачыў горы пінетачак — ад гэтых успамінаў стыне кроў. Кранулі ўспаміны былой блакадніцы, якая піша, што, пакуль у яе доме ёсць хлеб, яна ніколі не скажа, што жыве кепска. Сэрца шчаміла, калі чытала пра падлетка, які хаваў забітых малодшых брата і адну нагадовую сястрычку і гарэў нянавісцю да паліцая, што паліў аднавяскоўцаў разам з дзецьмі. Свайго пляменніка ён паспрабаваў выратаваць, загадаў яму: «Бяжы». Але той так і не змог кінуць сябра і згарэў разам з ім. І маці знайшла яго толькі па грузіках. Людзі стойка пераносілі і голад, і холад, але не здаваліся і ішлі да сваёй мэты.

Дарэчы, біяграфіі ўсё яшчэ працягваюць ісці. І дэпутаты вырашылі працягнуць праект. На другі том ужо сабралася 20 біяграфій.

— Мы паспрабавалі і пераканаліся, што справа добрая, і таму спыняцца не намераны, — кажа Максім Гурын. — Пакуль гісторыі назапашваюцца, будзем шукаць спонсараў. У мэтах захавання памяці і патрыятычнага выхавання моладзі мы рэалізоўвалі ўжо не адзіны праект па Вялікай Айчыннай вайне. Працуем з ветэранамі, ходзім у навучальныя ўстановы, расказваем дзецям пра вайну. Відавочцы тых часоў сыходзяць ад нас, і мы павінны зрабіць усё магчымае, каб памяць пра іх засталася.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ АЛЯКСАНДР МІКАЛАЕВІЧ.

Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

АДРАС РЭДАКЦЫІ: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 311 17 35;
e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.

Тыраж 14.804. Нумар падпісаны ў 19.30 30 верасня 2021 года.

«Мір 24»: новы «гулец» у нашай тэлепрасторы

Вядома, што кожны з нас у выбары інфармацыі аддае перавагу той крыніцы, якой давярае. Але не менш важным з'яўляецца і той момант, што нам там прапануюць. Прыгожай карцінкай і гучнымі загалоўкамі ў наш час здзіўляць ужо даволі складана, а вось уменне даць аўдыторыі якасны і актуальны кантэнт можа стаць перавагай. Як і тое, калі гледачу даюць свабоду самому рабіць высновы з пачутага і ўбачанага.

Зусім нядаўна ў агульнадаступных пакетах беларускіх кабельных аператараў адбылося «папаўненне»: сярод бясплатных тэлеканалаў з'явіўся «Мір 24». Ён з'яўляецца часткай Міждзяржаўнай тэлерадыёкампаніі «Мір», заснаванай яшчэ ў кастрычніку 1992 года ў выніку дагавора краін — удзельніц СНД. Пра тое, чым жыве тэлеканал, на якія тэндэнцыі арыентуецца і чаго ад яго варта чакаць масаваму гледачу, мы пагаварылі з галоўным рэдактарам студыі тэлебачання Прадстаўніцтва МТРК «Мір» у Беларусі Андрэем АЛЯКСЕЕНКАМ і намеснікам галоўнага рэдактара канала Аленай БУДРЫЦОВАЙ.

Праект «Попел Хатыні».

«Мір 24» пачаў сваю работу з 2013 года і сёння пазіцыянуецца як «першы еўразійскі інфармацыйны тэлеканал, які фарміруе новыя еўразійскія эліты». Тут аўдыторыі прапануюць у прамым эфіры выпускі навін з краін СНД (штодня кожную гадзіну). Плюс кругласутачна — інфармацыйныя стужкі бягучым радком з «гарачымі» навінамі і тэмамі дня. Акрамя гэтага, у тэлеканала шырокі асартымент праграм і праектаў уласнай вытворчасці, зробленых, у прыватнасці, беларускім прадстаўніцтвам, сярод якіх сёння «Еўразія даслоўна», «Культ асобы», «Нашы іншаземцы», «Пяць прычын застацца дома» і іншыя. Іх аўтары ведаюць дакладна, як нараджаецца беларускі хрусталь і дзе ў нас здабываюць соль, не горшую за марскую... А ў лінейцы «Еўразія рэгіёны» можна ладзіць завочныя вандроўкі, дзе гледачоў не раз падкуплялі каларыт і культурныя, гістарычныя палітры нашых рэгіёнаў. Аднак усё ж застаецца актуальным простае пытанне...

— Ці варта ўвогуле сёння сучаснаму чалавеку глядзець тэлевізар, калі ёсць шмат крыніц інфармацыі і настолькі распаўсюджаны інтэрнэт?

Андрэй Аляксеенка: — Так, але проста кожны сам вырашае, дзе шукаць тое, што хочацца паглядзець. Нават тэлебачанне сышло ў YouTube, і наш «Мір 24» сёння можна паглядзець там. Як у прамой трансляцыі, так і пасля выхаду той ці іншай праграмы ў эфіры. Глядач адкрывае сайт тэлеканала і трапляе адразу на платформу, дзе можа знайсці цікавую і актуальную інфармацыю пра Беларусь, Казахстан, Расію, Азербайджан, Арменію і г. д. Гляджу «Культ асобы» і дазнаёмся, чым жывуць вядомыя і знакамітыя. Заходзім на «Зроблена ў Еўразіі», і нам прапануюць цікавыя рэпартажы, напрыклад, з беларускага завода ў Віцебску, дзе за дзесяць хвілін ткуць дыван. А як уключаеш «Пяць прычын застацца дома», то можна перанесціся на курорт, скажам, Грузію. Тэлебачанне ў рэжыме рэальнага часу і на інтэрнэт-пляцоўцы — сёння ўжо непадзельныя рэчы...

Праект «Зроблена ў Еўразіі».

Алена Будрыцова: — Адзінае, тэлевізар вызваляе нам рукі. Уключыў любімы канал і можаш займацца сваімі справамі. Варта згадаць і пра вельмі пераканаўчы плюс тэлеканала «Мір 24». Ён заключаецца ў тым, што тут інфармацыя трансліруецца блокамі. Калі, напрыклад, раніцай вы не паспелі альбо праслухалі выпуск цікавай праграмы, то на працягу дня можна вярнуцца да яе перагляду.

А паглядзець, паверце, кожны знойдзе што. І, галоўнае, цяпер любы ахвотны зможа зрабіць гэта, таму што з нядаўняга часу «Мір 24» уваходзіць у бясплатныя пакеты кабельных аператараў. Лічыце, тэлеканал цяпер можа смела стаць госцем у доме кожнага беларуса. Праўда, пакуль нашым тэлегледачам яшчэ трэба пазнаёміцца з ім, прыгледзецца да прапаноў і вырашыць, ці варты такі госць душэўнага прыёму.

А. А.: — «Мір 24» інфармацыйна насычаны тэлеканал, які дае магчымасць сваёй аўдыторыі за лічаныя хвіліны перамяшчацца з краіны ў краіну і дазнавацца пра апошнія падзеі з тых рэгіёнаў, якія раней былі ў складзе адзінага Савецкага Саюза. Існуюць жа розныя аб'яднанні накшталт СНД, ЕАЭС, часткай якіх з'яўляецца Беларусь, але часта мы нічога не ведаем пра тыя працэсы, якія там адбываюцца. А наш канал якраз і распавядае пра гэта.

— То-бок вы прапануеце аўдыторыі пэўны зрэз падзей і іх аналітыку?

А. А.: — Мы паказваем і расказваем, што адбываецца і дзе мы жывём, якія ў нас эканамічныя, палітычныя ўзаемасувязі з іншымі краінамі. Можна сказаць, тут прысутнічае яшчэ і асветніцкі фармат, якога не хапала. Ёсць падзеі і эксперты, якія могуць патлумачыць сутнасць, а сам журналіст павінен быць нейтральным... Напрыклад, зусім нядаўна мы расказвалі, што ў Беларусі з'явілася сядзіба, дзе можна вырошчваць арганічныя прадукты з адпаведным знакам якасці. І мы ведаем, што ў ЕАЭС такі ж працэс запускаецца, таму дзённа магчымасць гледачам убачыць, як кожная з краін саюза працуе ў дадзеным кірунку і як пакупніку разумець, што яму прапануюць у краме. Так і па іншых напрамках тлумачым сутнасць і нюансы... Але ж людзям не будзеш навязваць нейкі пункт гледжання — яны проста пасля азнаямлення з інфармацыяй самі пачынаюць разумець, што да чаго.

А. Б.: — Думаю, тое, што мы робім, дадае больш яснасці адносна тых працэсаў, якія стаяць за вышэйзгаданымі абрэвіятурамі. Цяпер людзі змогуць наглядна бачыць і разумець, што канкрэтна для нашай краіны дае тое ці іншае аб'яднанне.

— Значыць пазіцыянаванне «Мір 24» як тэлеканала, які «фарміруе еўразійскія эліты», і мае на ўвазе той самы асветніцкі акцэнт?

А. А.: — Мы мала ведаем, што ўяўляе сабой палітычная, эканамічная ці бізнес-мадэль у краін былога Савецкага Саюза. Мы ўсе адносна маладыя, цікава, у якім напрамку кожная з дзяржаў развіваецца. І «Мір 24» расказвае якраз пра тое, чым жыве, скажам, Таджыкістан. Альбо хто яны, заможныя людзі Казахстана. У той жа Арменіі зараз вельмі добра развіваецца IT-індустрыя. І мы, калі знаёмім аўдыторыю з прадстаўнікамі гэтых эліт, прапануем ацаніць, як і ў чым развіваецца кожная з краін.

